Пралетары ўсіх м...

Зьвязда

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XIV
№ 269 (3867)
АЎТОРАК, 18 лістапада 1930 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць штодзенна за выключэньнем чацьвяргоў

Москва, В-ко ЦК КПСС ЗЕМ. СТУДЕНСЕКТ
ГОСУДАРСТВЕННАЯ НАУЧНАЯ БИБЛИОТЕКА

КАРТА польскага фашызму БІТА

Правал манэўру пілсудчыны з „дасрочным звальненьнем“ б. дэпутатаў грамадаўцаў

ЗВАЛЬНЕНЬНЕ Б. ДЭПУТАТАЎ ПАТРЭБНА БЫЛО ФАШЫЗМУ, КАБ СЬЦЯГНУЦЬ ПРАЦОЎНЫЯ МАСЫ СА ШЛЯХУ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ БАРАЦЬБЫ

Дэкларацыя б. пасла Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады Тарашкевіча

— Публікуемы намі дакумант зьяўляецца дэкларацыяй аднаго з правадыроў Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады ТАРАШКЕВІЧА, якая была зьмешчана пядаўна ў замежнай прэсе. Дэкларацыя дэмаскуе манэўр фашысцкага ўраду, зьвязаны з т. зв. «дасрочным звальненьнем» паслоў Грамады. Тарашкевіч прасядзеў у турме 3 з пал. гады.

ДА РАБОЧЫХ, СЯЛЯН І ПРАЦОЎНАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ

ТАВАРЫШЫ!

Дасрочнае звальненьне з вастрогу грамадаўскіх паслоў, дзеячоў Грамады, зроблена фашызмам для новага ачмучаньня мас: быццам звольненыя паслы вядуць нейкія гутаркі з урадам ці наогул з фашыстоўскім лягерам. Гэта сьведомая і правакацыйная мана прымушае мяне зьвярнуцца з адкрытым лістом да працоўных мас і хоць у кароткіх словах выясьніць сапраўднае палажэньне і сапраўдныя нашы адносіны да фашыстоўскага і нацыянал-дэмакратычнага лягеру.

НІХТО З НАС НЕ РАБІЎ НІЯКІХ СТАРАНЬНЯЎ АБ ЗВАЛЬНЕНЬНІ. Нашыя адмоўныя адносіны да праектаванага звальненьня былі публічна вядомы задоўга да звальненьня, як вядомы і мой пратэст у момант майго прымусовага высяленьня з вастрогу, бо мы загадзя ведалі, што гэты манэўр робіцца для баламутства мас.

Выпусьцілі не праз сымпатыю да нас, ані да беларускага вызваленчага руху. Не! Выпусьцілі таму, што ГЭТАГА ВЫМАГАЛА ПАТРЭБА ІХНЯЙ ПАЛІТЫКІ Ў НАЦЫЯНАЛЬНЫМ ПЫТАНЬНІ. Фашызму трэба было стварыць для мас выгляд зьмены курсу ў нацыянальнай палітыцы, стварыць уражаньне, што правадыры Грамады ідуць на ўгоду, здэзарыентаваць масы і падарваць да нас давер'е, каб сьцягнуць гэтыя масы са шляху рэвалюцыйнай барацьбы. Гэты манэўр меў расчысьціць грунт беларускаму нацыянал-фашызму для пашырэньня сваіх уплываў у масах і разам з тым аблягчыць стык з беларускімі нацыянал-дэмакратамі ў БССР.

Нашае звольненьне нікольні не азначае зьмены ўрадавага курсу. Судовы, паліцэйскі і падатковы тэрор шалее на ўсёй лініі. Ва ўмовах агульнага нябывалага гаспадарчага заняпаду краю, працоўны селянін і рабочы даведзены да крайняй галечы. Эксплёатацыя і нацыянальны ўціск узрастаюць.

Праўда, у адным кірунку даецца сапраўдная дапамога і сардэчная апека, гэта для стварэньня і падтрыманьня лягеру беларускага нацыянал-фашызму на чале з Луцкевічам, Астроўскім, Станкевічам і інш. Дзеля гэтага існуюць «субсыдыі на гімназіі, вуч. сэмін». У ТОЙ ЧАС, КАЛІ НА ЎПАРТАЕ МАСАВАЕ ДАМАГАНЬНЕ БЕЛАРУСКІХ ШКОЛ, ГЭТЫЯ ШКОЛЫ СУПРОЦЬ ВЫРАЗНАЙ ВОЛІ НАСЕЛЬНІЦТВА НЕ АДКРЫВАЮЦЦА, КАЛІ РАЗГРОМЛЕНА ТАКАЯ МАСАВАЯ КУЛЬТУРНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ, ЯК ТБШ, КАЛІ ЦЭНЗУРА БЯЗЬЛІТАСНА ДУШЫЦЬ УСЯКУЮ ПРАЯВУ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧАГА ДРУКУ, ТАДЫ ТРЭБА БЫЦЬ СЬЛЯПЫМ АБО ПРЫТВОРЛІВЫМ, ІЛЖЫВЫМ, КАБ НЯ БАЧЫЦЬ ВАРОЖАЙ СУТНАСЬЦІ ГЭТАЙ «ПОМАЧЫ», ГЭТЫХ ДАНАЙСКІХ ДАРОЎ ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ ДЛЯ НІБЫТА ДАБРА БЕЛАРУСКАГА НАРОДУ. Гэта служыць каменем апоры фашыстоўскай групы, але ў найменшай меры не здавальніе культурных патрэб беларускіх мас. Прэзыдэнт Масьціцкі ў часе свайго побыту ў Навагрудку, закладаў вуглавы камень сапраўды не пад беларускую гімназію, а ПАД ФАШЫСТОЎСКУЮ ЎГОДУ ПАМІЖ ПОЛЬСКІМ ПАНАМ І КАПІТАЛІСТЫМ І ПАМІЖ БЕЛАРУСКАЙ БУРЖУАЗІЯЙ І КУЛАЦТВАМ.

Гэтую ўгоду, прыкрываючыся нібыта «арганічнай», «культурнай» работай, арганізуе генэральны фашыстоўскі штаб беларускай контр-рэвалюцыі, каб падрыхтаваць вайну супроць СССР. Дзеля гэтага трэба разьбіць нацыянальна-вызваленчы рух на Заходняй Беларусі, трэба ачарніць посьпехі нацыянальна-культурнага і гаспадарчага будаўніцтва на Савецкай Беларусі, дзеля гэтага трэба паддаць контр-рэвалюцыйнай пары нацыянал-дэмакратычным групоўкам, якія працуюць у БССР. І гэта ўсё робіць «беларуская санацыя», замяняючы кола ўсёй беларускай разьцы. Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР, рашучы курс на сацыялістычную перабудову вёскі шляхам дабраволнай калектывізацыі пахавалі канчаткова надзею на буржуазнае перараджэньне БССР.

Шалёнае супраціўленьне кулацтва супроць калектывізацыі БССР, вялікшае расслаеньне вёскі і абвастрэньне клясавай барацьбы на ЗБ на грунце ўсіх мерапрыемстваў ураду, асабліва на грунце прымусовай камасацыі — з'актывізавалі, узварухнулі ўсю беларускую рэакцыю, лягер нацыянал-фашызму на ЗБ і нацыянал-дэмакратызму ў БССР, і папхнулі яе да чынных контр-рэвалюцыі і падрыхтоўкі вайны супроць СССР. Але сілы і сьвядомасьць працоўных мас у доўгай барацьбе за поўнае сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне настолькі вырасьлі і ўзмацніліся, што фашызму побач з тэрорам прыходзіцца рабіць розныя хітрыя манэўры, каб прыкрыць сутнасьць сваёй палітыкі і пусьціць чмут у вочы працоўных.

Вось, грамадзяне, якое палажэньне, вось чаму нас выпусьцілі. За 3½ гады нашага прабываньня ў вастрозе становішча шырокіх працоўных мас толькі пагоршала. Выпусьцілі нас пад напорам незадаваленьня мас. Але ян-бы там ня хітрылі, аднак, нашае звольненьне ня прынёсе таго факту, што ў вастрогах мучацца тысячы сялян і работнікаў, што дагэтуль сядзіць яшчэ пасол ВАЛОШЫН, што зноў арыштаваны сялянска-работніцкія паслы: Дварчанін, Гаўрылік, Валынец і Крынчык.

У выніку глыбокага эканамічнага і палітычнага крызісу нарастае вялізная рэвалюцыйная хвала масавага незадаволеньня і абурэньня, якая гатова ватапіць і зламаць фашыстоўскую дыктатуру. Фешыям заядла бароніцца і ўжывае розныя манэўры. Адзін з такіх манэўраў — гэта роспуск сойму, назначэньне новых выбараў. А гэта для таго, каб адвярнуць увагу мас ад беспасрэднай барацьбы і пасеяць ілюзіі — аданьні парлямантарызму, дэмакратызму. Існаваўшы сойм, ня гледзячы на яго робленую апазыцыю, быў прыпадай у руках фашыстоўскай дыктатуры. Але цяперака новы сойм мае быць яшчэ паслухмянейшым. Для правядзеньня такога сойму пускаецца ў ход увесь націк адміністрацыйнага прымусу і паліцэйскага тэрору. Але яшчэ ў большай меры, чым напі-небудзь раней, пускаецца ў ход АШУКАНСТВА І ПРАВАКАЦЫЯ.

Памятайце, што ня ўсе, хто будзе гаварыць супроць ураду, гэта сапраўдныя прыяцелі працоўнага народу. Я ўжо не кажу аб адкрытай польскай санацыі, аб яўных фашыстах, але таксама беларуская санацыя і беларуская хадэцыя і Сельсаюз, ППС, «Вызваленьне», а асабліва Стронніцтва Хлопскае, гэта горш-ці пепш скрытыя ворагі працоўных, староньнікі, падпоры фашызму. Сапраўды ўсё гэта адзіны фашыстоўскі лягер. Гэтаму лягеру трэба проціпаставіць адзіны рэвалюцыйны блёк сялян і рабочых усіх нацыянальнасьцяй, які правядзе барацьбу супроць фашыстоўскае дыктатуры — за сялянска-рабочы ўрад, за зямлю бяз выкупу, за 7-гадзінны рабочы дзень, за ўсе жыцьцёвыя эканамічныя і культурныя інтарэсы сялян і рабочых, за нацыянальнае самавызначэньне аж да аддзяленьня.

Б. ТАРАШКЕВІЧ.

Палачныя выбары ў Польшчы

У Зах. Беларусі і Зах. Украіне выбары адбываліся па-ваеннаму

Працэс б. дэпутатаў беларускага рабоча-сялянскага клюбу

Манархісцкае віленскае «Слово» ў нумары 263 падае, што 18 лістапада ў Віленскім акруговым судзе пачнецца справа былых дэпутатаў беларускага рабоча-сялянскага клюбу Гаўрылюка, Дварчаніна, Валынца і Крынчука і шасьці працаўнікоў Цэнтральнага сакратарыяту гэтага клюбу. Усе яны абвінавачваюцца ў антыдзяржаўнай дзейнасьці. Абвінаваўчы акт напісан на 150 старонках машыннага пісьма.

Абвінавачваць будзе вядомы рэакцыянэр віцэ-пракурор Здановіч.

Працэс над б. дэпутатамі беларускага рабочага-сялянскага клюбу зьяўляецца адначасова працэсам над нацыянальна-вызваленчым рухам працоўных мас Зах. Беларусі. У той-жа час гэты працэс зьяўляецца пачаткам шырокай кампаніі польскага фашызму па падрыхтоўцы ўзброенага нападу на СССР, а ў першую чаргу на яго фарпост — БССР.

Таму працоўныя БССР павінны ўзьняць рашучы голас пратэсту супроць расправы польскага фашызму над працоўнымі масамі Зах. Беларусі і адначасова пільна сачыць за далейшымі падзеямі каля сваёй заходняй мажы, каб у кожную хвіліну, калі наглечая пілсудчына спрабуе пераступіць мяжу Савецкага Саюзу, даць руйнуючы адпор.

КРЫВАВЫЯ СУТЫЧКІ З ФАШЫСТЫМІ У ВАРШАВЕ

ВАРШАВА, 17. Толькі што скончылася падача галасоў у Варшаве. Удзел выбаршчыкаў, паводле прыблізнай ацэнкі, складае ня больш 50 проц. Ажыцьцяўленьне, выклікане выбарамі ў цэнтры гораду, невялікае. Паліцыя не дапускае агітацыі апазыцыйных партый, у асаблівасьці **рабоча-сялянскага блёку.** Усюды паліцыя была аказана вялікая дапамога з боку баявых дружын фашыстых, якія развяжджалі цэлы дзень па гораде на грузавіках і выступалі супроць агітатараў левага рабоча-сялянскага блёку. Ня гледзячы на гэта, у рабочых раёнах Варшавы на працяку ўсяго дня ішла жвавая агітацыя ў карысьць сьпісу № 22 «рабоча-сялянскага адзінства». Вялікая колькасьць агітатараў сьпісу нумар 22 арыштавана паліцыяй. У радзе раёнаў адбыліся крывавыя сутычкі паміж камуністымі і фашыстымі.

Пачынаецца падлік галасоў.

ВАРШАВА, 17. Самым характэрным момантам у выбарах зьяўляецца тое, што **выбары ў некаторых акругах праводзіліся па-ваеннаму** пад музыку. Гэтым тлумачыцца, што ў радзе сельскіх раёнаў, асабліва на так званых «усходніх акраінах» усе 100 проц. выбаршчыкаў галасавалі за пілсудчыкаў. У Зах. Беларусі ўсе амаль галасы паданы за пілсудчыкаў. У Вальні тое самае. Такія-ж факты мелі месца ў Верхняй Сілезіі і часткова ў Заходняй Галіцыі.

ВАРШАВА, 17. Згодна канчатковым выбарам у сойм пілсудчыкі атрымалі 248 мандатаў, нацыянал-дэмакраты—64, «цэнтралеў» — 80 мандатаў, **украінскі і беларускі буржуазны блёк — 21** мандат, хрысьціянскія дэмакраты, уключаючы Карфанты — 14 мандатаў, **яўрэі** — 7 мандатаў (у тым ліку адзін ад артадоксаў-пілсудчыкаў), **левы рабоча-сялянскі блёк**, ня гледзячы на шалёны тэрор — 4 мандаты, **«сялянская самадапамога»** — 1 мандат, **немцы** — 5 мандатаў.

Левы рабоча-сялянскі блёк у **Варшаве** атрымаў 1 мандат, у **Лодзі** — 2 мандаты, у **Дамброўскім басэйне** — 1 мандат.

«Сялянская самадапамога» атрымала мандат у акрузе **Лукаў** (Люблінскае ваяводзтва)

ВАРШАВА, 17. Пілсудчыкі трачыста сьвяткуюць «перамогу». Адміністрацыйны апарат «аказаўся на вышыні» становішча. Лік мандатаў, атрыманых пілсудчыкамі, на 116 мандатаў перавышае колькасьць, якую яны мелі ў мінулым сойме. «Цэнтралеў» атрацілі 82 мандаты. Лік дэпутатаў нацыянальных меншасьцяй пілсудчыкі зьменшылі да 39 (супроць 72 у мінулым выбары). Левы рабоча-сялянскі блёк, ня гледзячы на шалёны тэрор, атрымаў 4 мандаты. Лева-сялянская «Самадапамога», ня гледзячы на шалёны выбарчы тэрор, захавала свой адзін мандат.

Прадстаўнікі рэвалюцыйнай украінскай і беларускай арганізацый «Сельроб» і «Змаганьне» наогул не дапушчаны ў сойм. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што галоўны ўдар фашыстых шляхам простага тэрору, анулявання сьпісаў, падлогаў і г. д. быў накіраваны супроць левых рабоча-сялянскіх арганізацый. У ходзе цяперашніх выбараў прынцып тайнага галасаваньня канчаткова скасован пілсудчыкамі. Афіцыйны друк ня скрывае, што ў большасьці мясцовасьцяй на правінцыі адбывалася адкрытае галасаваньне. Адкрытае галасаваньне ўжывалася ў большасьці округ Дамброўскага басэйну, Лодзінскай акрузе, Верхняй Сілезіі і нават у Варшаўскім ваяводзтве.

Сялян Зах. Украіны і Зах. Беларусі выводзілі галасаваць у арганізаваным парадку. У **Новагрудзкім** ваяводзтве сялян вялі галасаваць за ўрадавы сьпісак з аркестрам. Апазыцыйная прэса заяўляе, што «яна ня сумняваецца ў дапушчэньні іншых злоўжываньняў».

Тэрор супроць рабоча-сялянскіх арганізацый, які лютаваў на працягу ўсёй прадвыбарчай кампаніі, яшчэ больш узмоцніўся ў дзень выбараў. Амаль з усіх раёнаў паведамляюць аб масавых арыштах і крывавых сутычках паміж рабочымі і фашысцкімі баявымі дружынамі.

Расправа польскага фашызму над беларускім польскім рабоча-сялянскім клюбам „Змаганьне“

Сёньня, праз два дні пасьля «пераможных» выбараў Пілсудскага, на акупаванай Заходняй Беларусі ў Віленскім акруговым судзе пачынае судовая камэдыя фашысцкая расправа над 4-ма рэвалюцыйнымі беларускімі дзеячамі, дэпутатамі Беларускага рабоча-сялянскага клюбу «Змаганьне» — т. т. **Гаўрылікам, Крынчыкам, Валынцом і Дварчанінам** — усе члены сакратарыяту Беларускага пасольскага клюбу. Большасьць з гэтых дэпутатаў ужо раней асуджана фашысцкім судом: **Дварчанін і Валынец—на 6 гадоў катаргі, Крынчык—на адзін год.**

Сёньняшні працэс мае асаблівае значэньне. Гэтым працэсам фашызм хоча «апраўдаць» нячувана жорсткі белы тэрор, які шалее на ўсёй Зах. Беларусі, **апраўдаць разгром масавай 15-тысячнай культурнай арганізацыі ТБШ, разгром беларускага нацыянал-вызваленчага руху, карныя экспэдыцыі і тысячы арыштаў і збойстваў.**

На прыкладзе працэсу Грамады 1927 г., акт абвінавачваньня супроць дзеячоў «Змаганьня» зроблен ахраньнікам пракурорам у такой правакацыйнай форме, каб «даказаць» (пры дапамозе тэй-жа ахранкі), што паслы «Змаганьня» зьяўляюцца «агентамі Масквы», што ўвесь нацыянальна-вызваленчы рух на Зах. Беларусі зьяўляецца рухам не працоўных мас Зах. Беларусі, а «імпартаваны» звонку. Фашызму патрэбна гэта новая крывавая камэдыя, гэта новая правакацыя, каб «легалізаваць» усю жудасьць і дзікую сваволю, якая ціпер шалее на Зах. Беларусі.

Гэты працэс азначае пачатак **новага фашысцкага паходу** супроць дзесяткаў тысяч працоўных беларускіх мас, з сотнямі катаржных прысудаў для рэвалюцыйных рабочых і працоўных сялян. Польскі акупант, разграміўшы стотысячную Грамаду ў 1927 годзе, думаў, што ён даў сьмяротны ўдар па нацыянальна-вызваленчым руху, спадзяваўся, што яму ўдалося пры дапамозе соцень гадоў катаргі і катаваньняў задушыць гэты рух. Але фашызм памыліўся: фашызму не ўдалося задушыць у працоўных масах рэвалюцыйнага духу Грамады; не рэвалюцыйныя традыцыі і баявыя лёзунгі прабіліся скрозь краты польскіх казэматаў, скрозь прыгнушанае падпольле і знайшлі яшчэ больш моцны водгук сярод працоўных мас.

Рэвалюцыйны нацыянальна-вызваленчы рух пераходзіць у новую баявую паласу, узмацняючыся ўнутры ідэалёгічна, арганізацыйна, адсякаючы ад сябе ўсіх часовых спадарожнікаў, кар'ерыстых і рэнэгатаў, выкідваючы іх вон ў сьмяцьцёвую скрынку, ізалюючы ад працоўных мас групу дэфэнзыў шчыкаў-ахранікаў, Луцкевіча, Астроўскага і іншых, становячыся больш маналітным, стойкім, грунтуючыся на шырокіх працоўных масы гораду і вёскі Зах. Беларусі. Яскравым выразам гэтага неаслабнага баявога духу зьявіліся дэпутаты Беларускага Рабоча-Сялянскага Пасольскага Клюбу, т.т. Дварчанін, Гаўрылік, Валынец, Крынчык і Грэцкі. Іх гэраічная рэвалюцыйная стойкасьць і адпорлівасьць, ня гледзячы на жорсткія напады паліцэйскіх, фашысцкіх банд, сьмяротныя [illegible] іх рэвалюцыйныя заклікі, якія маалізавалі масы да барацьбы [illegible] зьненавіджаных акупантаў, выклікалі лютую нянавісьць да іх з боку фашысцкага зброду, з боку нацыянал-фашыстых як польскіх, так і беларускіх.

Поўнае паражэньне палітыкі фашысцкіх акупантаў і беларускіх нацыянал-фашыстых у адносінах да былых грамадаўскіх дэпутатаў—Тарашкевіча, Рак-Міхайлоўскага, Мятлы і Валошына, палітыкі, якая імкнулася ва што-б там ні стала зламаць іх адпор і перамаўніць на свой бок, **баявыя заявы Тарашкевіча** і іншых былых дэпутатаў Грамады супроць польскай акупацыі і нацыянал-фашыстых, Луцкевіча і іншых, магутны рост рэвалюцыйнага руху ў горадзе і на вёсцы, буйная перамога рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху над беларускім нац.-фашызмам у часе дадатковых выбараў у сойм летам 1930 году на Лідчыне і Сьвяцяншчыне — выклікалі шалёнства з боку ўсіх фашысцкіх груп.

Польскія акупанты пры актыўнай дапамозе і правакацыйных захадах Луцкевіча-Астроўскага пачынаюць новы крывавы паход супроць працоўных мас Зах. Беларусі. Першы ўдар панесен па дэпутатах «Змаганьня». Следам за імі арыштаваны сотні рэвалюцыйных рабочых і сялян. У той-жа самы час фашызм імкнецца выбраць сваімі дэпутатамі сваіх асноўных агал целых фашысцкіх паслугачоў і іменна на Зах. Беларусі, там, дзе кожны працоўны, дзе кожная хата і варштат ненавідзяць акупанта і распачліва змагаюцца супроць гвалту і грабежніцтва, супроць эксплёатацыі і акупацыі.

Працэс 18-га лістапада **зьяўляецца адным са зьвеньняў лютай антысавецкай кампаніі польскага фашызму. Ён носіць яўна правакацыйны характар, накіраваны да таго, каб пры дапамозе загатаваных праз дэфэнзыву дакумантаў, справакаваць СССР,** як ён гэта хадеў зрабіць і з ранейшым працэсам Грамады. Тэрор, які ціпер шалее ва ўсёй Польшчы і асабліва на Зах. Беларусі і Зах. Украіне, накіраваны супроць рэвалюцыйнага руху працоўных мас усёй Польшчы, супроць Савецкага Саюзу, імкнецца затапіць у моры крыві магутны рост рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху ў Зах. Беларусі і Зах. Украіне, каб такім спосабам «супакоіць» плянцдарм для надыходзячай вайны.

Працэс дэпутатаў клюбу «Змаганьне» сустрэне магутны выбух абурэньня з боку ўсіх працоўных мас Польшчы, а асабліва працоўных мас Зах. Беларусі, таксама як працоўныя масы Зах. Беларусі рэагавалі на падзеі ў Алекшыцах і на арышт дэпутата Дварчаніна.

Працоўныя масы ўсёй Польшчы бачаць у працэсе над «Змаганьнем» новы акт наступленьня фашызму супроць рэвалюцыйнага руху, жорсткай расправы польскіх акупантаў з нацыянальна-вызваленчым рухам, падрыхтоўкі да набліжаючагася рашаючага моманту рэвалюцыйнай схваткі **клясы супроць клясы.**

Працоўныя БССР ня могуць спакойна глядзець на тое, што адбываецца на тым баку мяжы. **Працэс над «Змаганьнем»**, шалёны тэрор, які бушуе ва ўсёй Польшчы, **азначае ў той-жа самы час узмацненьне падрыхтоўкі да вайны, мабілізацыю з боку фашызму ўсіх фашысцкіх сіл у паход супроць Савецкага Саюзу.**

Усе працоўныя масы БССР павінны моцна адгукнуцца на падзеі, якія адбываюцца зараз у Польшчы, і ўзьняць свой магутны голас пратэсту супроць працэсу польскага фашызму над беларускімі рэвалюцыйнымі дзеячамі, над нацыянальна-вызваленчым рухам.

25-га ЛІСТАПАДА—ПРАЦЭС НАД ШКОДНІКАМІ

МАСКВА, 17. Справа аб контр-рэвалюцыйнай арганізацыі «Саюз інжынэрных арганізацый» («прамысловая партыя») назначана да слуханьня 25 лістапада б. г. у спэцыяльным судовым «прысутствіи» Вярхоўнага суда СССР, у складзе: старшыні тав. Вышынскага А. Я., членаў — т. т. Антонава-Саратаўскага В. П., члена вярхоўнага суда Саюза — тав. Львова В. Л. (рабочага заводу «Амо») і запаснога судзьдзі тав. Іванова П. А. (рабочага заводу «Красный Путиловец»).

Дзяржаўным абвінаваўцам выступіць тав. Крыленка Н. В.

Засталося толькі 2 ДНІ

За гэты тэрмін адгрузіць ва што-б там ні стала 57.684 тоны бульбы

Да 20 лістапада поўнасьцю адгрузіць бульбу пралетарскім цэнтрам

Падвоіць адгрузку

НАМ. СТАРШЫНІ СНК БССР Т. **КАЛІНІН** ПАСЛАЎ НАСТУПНУЮ ТЭЛЕГРАМУ ЎСІМ САКРАТАРОМ РК, СТАРШЫНЯМ РВК І АСОБНАЎПАЎНАВАЖАНЫМ СНК:

— ТЭМПЫ ЗАГАТОВАК І АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ НЕВЫСТАРЧАЛЬНЫЯ. ПРЫМЕЦЕ ЗАХАДЫ ДА ПАДВАЕНЬНЯ ТЭМПАЎ ЗАГАТОВАК І АДГРУЗКІ. ПРЫ АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНІ ПЛЯНУ ЗАГАТОВАК І АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ЎЛІЧЭЦЬ НЕАБХОДНАСЬЦЬ ЗАВЕСЬПЯЧЭНЬНЯ СПЭЦЫЯЛІЗАВАНЫХ СЬВІНАГАДОЎЧЫХ КАЛГАСАЎ.

Забясьпечыць баявыя тэмпы ільназагатовак

За подпісамі члена бюро ЦК КП(б)Б т. **ГАНТМАНА** і нам. старшыні СНК БССР т. Калініна паслана наступная тэлеграма сакратаром РК КП(б)Б, старшыням РВК і асобнаўпаўнаважаным СНК:

— Загатоўкі ільнянога семя ў кастрычніку і за першую палову лістапада правалены. Паводле пастановы Бюро ЦК КП(б)Б загатоўкі ільнянога семя і канапель прыраўнаны па сваім значэньні да загатовак і вывазу бульбы.

Прапануецца: 1. Безадкладна стварыць пералом і забясьпечыць баявыя тэмпы загатовак; 2. У пяцідзённы тэрмін праверыць цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам, паладзіць сапраўдны ўлік выкананьня гэтых заданьняў, да тых, хто не здае лён, ужываць прадугледжаныя законам рэпрэсіі; 3. Здачу па кантрактацыйных дагаворах скончыць не пазьней 1-га сьнежня.

Кіраўніцтва загатоўкамі ільнянога семя ўскладзена на кіруючую чацьвёрку па бульбазагатоўках з надачай ёй надзвычайных паўнамоцтваў.

На асобнаўпаўнаважаных СНК ускладаецца адказнасьць за правядзеньне загатовак ільнянога семя і канапель аднолькава, як на кіруючых раённых работнікаў.

347—замест 700

За 16 лістапада па БССР адгружана 5.551 тона бульбы. ЛСПО адгружана 2.183 тоны, ЛВО — 336 тон, Паўночна-Заходняму Саюзу — 567 тон, МСПО — 995 тон, Данбасу і Украіне — 1.113 тон, Паўночнаму Каўказу — 357 тон.

Тэмпы адгрузкі ўсё яшчэ не дасягнулі належнае вышыні, ня гледзячы на тое, што яны адносна павялічваюцца. Замест 700 вагонаў у дзень адгружаецца значна менш: за 15 лістапада — 212 ваг., за 16 лістапада—347 ваг.

За ўвесь час адгружана: ЛСПО — 76,5 проц. пляну, ЛВО — 85,3 проц., Паўночна-Заходняму Саюзу—65 проц., МСПО — 58,5 проц., Данбасу і Украіне — 50,6 проц., Паўночнаму Каўказу — 23,2 проц.

За тры дні, якія засталіся да сканчэньня тэрміну адгрузкі, трэба адгрузіць яшчэ 57.684 тоны.

Зводка аб ходзе адгрузкі бульбы на 17-XI

Толькі 68,1%

АДГРУЗЧЫКІ	Плян у тонах	Адгружана ў тонах	Процант выкананьня пляну
Белкаапсаюз . . .	116.850	66.608	57
Белільнасаюз . . .	64.150	56.708	88,4
УСЯГО па БССР: . .	181.000	123.316	68,1

УВАГА: паводле вестак, надрукаваных у «Зьвязьдзе», на 16 лістапада было адгружана 113.016 тон; на 17-ае лістапада—ужо 123.316. Такое значнае павялічэньне атрымалася за лік звыш 5.000 тон, адгружаных без паказаньня поўнага адрасу і выключаных у раённыя зводкі.

Цягнуцца ў хвасьце

Наступныя раёны ганебна адстаюць у выкананьні баявога заданьня па адгрузцы бульбы: Асьвейскі, Бешанковіцкі, Буда-Кашалёўскі, Бягомльскі, Ветнаўскі, Высачанскі, Вульскі, Гомельскі, Дубровенскі, Крупскі, Камарынскі, Лепьчыцкі, Рэчыцкі, Старобінскі, Сеньненскі, Чэрэйскі, Багушэўскі, Брагінскі, Барысаўскі, Бярэзінскі, Віцебскі, Вальнецкі, Грэскі, Дрысенскі, Круглянскі, Клічаўскі, Лёзьнянскі, Лагойскі, Расьнянскі, Расонскі, Сурасні, Церахаўскі і Чырвона-Слабодзкі.

Вымова Чачэрскаму РВК

На пасяджэньні 17 лістапада кіруючая чацьвёрка па бульбазагатоўках вынесла пастанову, у якой прызнала тэмп загатовак і асабліва адгрузкі бульбы невыстарчальным.

РВК прапанавана прыняць усе меры да падвоеньня тэмпаў загатовак і адгрузкі бульбы.

Зусім незадавальняючым прызнаны ход адгрузкі гародніны. РВК прапанавана мабілізаваць усе сілы для ўзмацненьня тэмпаў загатовак і адгрузкі гародніны. Праўленьню Белсадсаюзу абвешчана вымова за слабую работу.

За зрыў адгрузкі 300 тон бульбы абвешчана суровая вымова старшыні Чачэрскага РВК.

Адказ

НАДПАЛЬШЧЫКАМ ВАЙНЫ

Дэкларацыя навуковых работнікаў

МАСКВА, 16. Акадэмікі Бах, Палагін, Вавілаў, прафэсары Ярылаў, Завадоўскі, Збарскі, Сепп, Бушынскі, Абрыносаў, Сысін, Зеленка, Келер, Тулайкоў, Рыхтэр, Шэханаў і навуковыя работнікі Семяноўскі, Маслоў і Сьвярдлоў ад імя «Варкитсо» выступілі з дэкларацыяй, у якой пішуць:

— Справа пралетарыяту—наша кроўная справа. З ім непарыўна, у барацьбе, у перамогах і ў паражэньнях трымалі мы і нашу мысьль, як навукова-тахнічныя работнікі, і нашу сумленнасьць грамадзяніна і наша жыцьцё. Мы неразлучны з ім, калі ён ажыцьцяўляе бяспрыкладнае ў гісторыі будаўніцтва новага грамадзтва, вядучы барацьбу за вызваленьне ўсяго чалавецтва ад прыгнечаньня і эксплёатацыі капіталам. Мы неразлучны з ім, аддаючы ўсе свае сілы, веды і практыку, калі ён, пад кіраўніцтвам УсеКП(б), змагаецца за хутчэйшае ажыцьцяўленьне пляну вялікіх работ, за ажыцьцяўленьне пяцігодні за чатыры гады. Мы неразлучны з ім, калі ён бязьлітасна распраўляецца і расстрэльвае 48 наймных агентаў капіталу, прынёсшых навуковай назвай сваю чорную справу і прабавуўшых сарваць касьцістай рукой голаду сацыялістычную пяцігодку.

Разам з рабочай клясай мы аднадушна патрабуем вышэйшай меры пакараньня шкоднікам: Рамзіным, Ларычавым, Калініннавым і іншым, якія прабавалі штыхом чужаземных інтэрэсантаў зьнішчыць Краіну Саветаў. Мы здолеем перарабіць нашы мірныя лябараторыі ў акопы і траншэі фронту, які вырашае лёс народаў і класаў, і наша пяро вучонага абярнуць у вінтоўку байца.

ВОСТРАЙ ЗБРОЯЙ ЛЕНІНСКАЙ ТЭОРЫІ

біць па апартунізьме, біць па права-«лявацкім» блёку!

Праз баявыя тэмпы партыйнай вучобы аўладаць вышынямі марксызму-ленінізму, павысіць ідэйную непахіснасьць і тэарытычны ўзровень партыйных мас

Узброіць масы марксыцка-ленінскай тэорыяй

Выкаваная і загартаваная ў рашучых скватах на барыкадных бойках з клясавым ворагам, у бязьлітасным змаганьні супроць апартуністаў, партыя бальшавікоў была, есьць і назаўсёды за станецца вернай наказам Леніна. Наша партыя — арганізатар і правадыр Кастрычніцкіх перамог, —узьнімуць творчую энэргію мільённых пралетарскіх і працоўных мас на сацыялістычнае будаўніцтва, стрымліваючы на гэтым гістарычным фронце усё новыя перамогі за перамогай, з рэвалюцыйнай настойлівасьцю і мужнасьцю перамагаючы ўсе труднасьці на гэтым шляху, нікому не дазволіць пахіснуць стойкасьць і маналітнасьць яе сталёвых радоў.

Правыя і «левыя» апартуністы, якія здрадзілі ленінскім прынцыпам бальшавіцкага адзінства партыі, якія сталі на шлях двурушніцкай, здрадніцкай дзейнасьці на шлях фракцыйнасьці і бяспрынцыпнага блёкавання, сустрэлі рашучы адпор з боку ўсёй партыі. Яны асуджаны кожнай пасобнай ячэйкай, як кулацкая агентура ў радах партыі, і бязьлітасна і беспаваротна выганяюцца і будуць выганяцца з радоў партыі.

Задачы далейшага пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, задачы сацыялістычнага наступленьня на ўсім фронце на капіталістычныя элементы гораду і вёскі вымагаюць ад кожнай партыйнай арганізацыі, кожнай пасобнай ячэйкі і камуністага павышэньня клясавай пільнасьці, яшчэ большага ўзмацненьня барацьбы супроць апартуністаў з правага і «лявага» лягеру і прыміраньню да іх. У ажыцьцяўленьні гэтых задач, якія праходзяць у складаных абставінах вострае шалёнага супраціўленьня клясавых ворагаў, **партыйныя арганізацыі пасіўны сыстэматычна ўзбройваць кожнага камуністага марксыцка-ленінскай тэорыяй**, выкрываць да канца перад шырокімі масамі капітулянцкую праграму і двурушніцкую тактыку правых і «левых» апартуністаў. Партыйная вучоба павінна заняць у рабоце партарганізацый цэнтральнае месца, яна павінна быць увязана і падпарадкавана задачам мабілізацыі мас на пасьпяховае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі. Партыйная вучоба на прадпрыемствах непадзельна зьвязана з задачамі выкананьня прамфінпляну, ажыцьцяўленьня баявога лёзунгу: пяцігодку — за чатыры гады; у вёсцы — з задачамі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і правядзеньня бягучых гаспадарча-палітычных кампаній. Усякія ніжэйшыя дазволенага падыходу, выкліканага прынцыпаўленьня практыкі тэорыі павінны сустрэць рашучы адпор. Трэба павесьці барацьбу з недацэнкай партыйнай асьветы, як дужым праяўленьнем апартунізму на практыцы.

ЦК УсесКП(б) у пісьмаве аб партвучобе ад 13-га верасьня, рашуча асуджаючы недацэнку партасьветы, якая назіраецца ў некаторых арганізацыях, запрапанаваў мясцовым партарганізацыям ужыць рашучыя захады да ня пашырэньня і паляпшэньня якасьці партыйнай вучобы.

З гэтага часу прайшло больш двух месяцаў, а патрэбнага пералому ў справе камплектаваньня сеткі партасьветы і наладжаньня рэгулярных заняткаў няма ў радзе раённых партарганізацый. У некаторых ячэйках партыйцы ахоплены партвучобаю толькі на 25-50 проц. Наперакор дырэктывам партыі аб уцягненьні ў першапачатковыя школы партыйнай асьветы ўсіх кандыдатаў партыі, на Кастрычніцкім раёне ахоплена партвучобай толькі 15 проц. кандыдатаў.

З прычыны невыстарчальнай падрыхтоўчай палітычнай і арганізацыйнай работы да навучальнага году, у некаторых арганізацыях зрываюцца заняткі. Паўважлівыя адносіны да вучобы складу слухачоў, часамі паўдалы падбор кіраўнікоў партасьветы, адсутнасьць падручнікаў, заняцьце вызначанага для партвучобы часу іншай грамадзкай работай і рад неладаў тэхнічнага парадку зьяўляюцца прычынамі частых зрываў заняткаў. У тых ячэйках, дзе зрыў заняткаў увайшоў у сыстэму, назіраецца адсеў са школ партасьветы. Асноўнай-жа прычынай такога адмоўнага зьявішча ў справе аўладаньня партыйнымі масамі марксыцка-ленінскай тэорыяй зьяўляецца апартуністычная недацэнка партыйнай асьветы, што назіраецца ў радзе ячэек і пасобных раённых партарганізацыях.

Партыйныя арганізацыі і ячэйкі павінны неадкладна мабілізаваць на зьнішчэньне паказаных недахопаў, сканцентраваць увагу партыйных і беспартыйных мас вакол задач ленінскай вучобы, даючы адпор усякім праявам яе недацэнкі. Побач з гэтымі мерапрыемствамі неабходна зьвярнуць належную увагу на падбор прапагандысцкіх сіл і наладжаньне пры партбінэтах пастаянай кансультацыі. Школы партасьветы павінны быць забясьпечаны ідэалёгічна ўстойлівымі, праверанымі на рабоце кіраўнікамі, здольнымі выразна кіраваць глыбокай прапрацоўкай палітыкі партыі і арганізаваць масы на яе практычнае ажыцьцяўленьне.

Задачы паляпшэньня якасьці вучобы патрабуюць сыстэматычнага кіраўніцтва работай школ партасьветы з боку партячэек і райкомаў. Нельга выпускаць з-пад увагі задач арганізацыі і ўцягненьня ва ўсе існуючыя формы вучобы партыйнага актыву. Трэба правесьці ўсе неабходныя мерапрыемствы ў гэтай справе ў адпаведнасьці з дырэктывамі партыі.

Павышаючы ідэёвы ўзровень марксыцка-ленінскай тэорыяй партыйных і беспартыйных пралетарскіх і калгасных мас, даючы рэшучы адпор усякім праявам правага і «лявага» апартуністаў, ачышчаючы бальшавіцкія рады ад двурушнікаў, фракцыянэраў, — забясьпечым пасьпяховае ажыцьцяўленьне ленінскай палітыкі партыі ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва.

Дырэктывы ня выконваюцца

Задача аб поўным ахопе членаў і кандыдатаў партыі марксыцка-ленінскай вучобай па Фрунзаўскім раёне (Менск) застаецца на сёньняшні дзень невыкананай. Большасьць партколектываў і ячэек да выкананьня дырэктыў ЦК аб партвучобе адносяцца па-казённаму. Но адна ячэйка не правяла грунтоўнай падрыхтоўчай работы да разгортваньня партвучобы, да забясьпечэньня бесперабойнасьці заняткаў у школах. Да масы камуністых ня былі даведзены палітычныя задачы і апалітычнае марксыцка-ленінскае тэорыі праз школы партыйнае асьветы.

Партыйныя ячэйкі яўна недаацэнілі значэньня партыйнай вучобы ў справе павышэньня баяздольнасьці партарганізацыі, у справе барацьбы з усякімі ўхіламі ад ленінскай лініі партыі.

Яшчэ 27 пастрычніка, бюро Фрунзаўскага райкому КП(б) адзначыла, што палітычную недацэнку значэньня партвучобы нельга разглядаць інакш, як праявы правага апартунізму на практыцы і што рад партыйных ячэек сваёй бязьдзейнасьцю спрыяюць зрыву заняткаў у парыйных школах.

Бюро райкому прыцягнула да партыйнай адказнасьці бюро ячэйкі **Аўтакіраўніцтва** і бюро парткалектыву фабрыкі **«Кастрычнік»** і заводу **«Камунар»**, друкарні імя **Сталіна** і інш. за зрыў партвучобы і прапанавала неадкладна забясьпечыць поўны ахоп камуністых школамі партыйнай асьветы. Аднак, ня гледзячы на катэгарычныя прапановы райкому, патрэбнага зруху ў справе партвучобы ў гэтых ячэйках, як і ў радзе іншых, няма. Ячэйка Аўтакіраўніцтва ўсё яшчэ ігнаруе пытаньні партыйнай асьветы...

Пастановай райкому было забаронена праводзіць у дні партвучобы якія-б там ня было сходы, пасяджэньні і г. д. Але гэта пастанова ня выконваецца. Партвучоба вельмі часта зрываецца імянна ў сувязі з тым, што ў дні вучобы склікаюцца ўсякія сходы і інш.

Партвучоба на Фрунзаўскім раёне пад пагрозай зрыву. Далёка ня ўсе члены і кандыдаты партыі ахоплены сыстэмай партыйнай асьветы. У школах і на клясных курсах вельмі нізкае наведваньне.

Райкомам у апошнія дні прыняты рад мерапрыемстваў для ліквідацыі прарываў у партвучобе.

С.

„У адказ на двурушніцтва правых і „левых“ апартуністых мы ўступаем у рады КП(б)Б“

У партыю Леніна

Адозва да ўсіх перадавых ударнікаў, старых рабочых фабрыкі „Кастрычнік“ і ўсіх прадпрыемстваў Фрунзаўскага раёну

Тав. Розаў, рабочы ф-кі «Кастрычнік», уступіў у партыю

Мы, група старых рабочых-перадавых ударнікаў швейнай фабрыкі «Кастрычнік», сабраўшыся для абгаварэньня пытаньняў, вынятых з трудасьцямі росту сацыялістычнай прамысловасьці, аднадушна прышлі да высноў, што:

1. Ня гледзячы на ўсе труднасьці, якія мы зараз перажываем, рабочая кляса, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пасьпяхова скончыла другі год пяцігодкі, рашуча змагаецца за тэмпы ударнага кварталу, які зьяўляецца прадзьвер'ем трэцяга году пяцігодкі.

2. Рабочая кляса, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, з посьпехам праводзіць ліквідацыю кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі.

3. Заўсёды, калі краіна перажывае труднасьці, клясавыя ворагі пачынаюць арганізоўвацца для барацьбы супроць пралетарскай дыктатуры. «Прамысловая партыя» інжынэраў-шкодніка ў на чале з Рамзіным дабівалася аднаўленьня старых парадкаў. Яшчэ да гэтага часу прадстаўнікі буржуазнай інтэлігенцыі мараць аб звароце фабрык і заводаў капіталістым і зямлі памешчыкам. Буйныя дасягненьні пралетарыяту прыводзяць іх да шаленства. Яны, як усякія, асуджаныя на пагібель, выпускаюць прадсьмяротную атруту, самі задыхаючыся ў ёй. Моцная рука пралетарскай дыктатуры, апіраючыся на шырокія масы рабочых і працоўных сялян і па гэты раз зьмяншыла апэтыты гэтых ворагаў, якія працуюць у поўным кантакце з замежным капіталам.

4. Правыя і «левыя» апартуністы, зьяўляючыся кулацкай агентурай унутры партыі, цягнуць партыю і рабочую клясу назад ад пастаноў XVI зьезду УсесКП(б).

5. У адказ на двурушніцтва правых і «левых» апартуністых, якія ня ведаць у магутнасьць рабочае клясы і, якія сваёй шкодніцкай ідэалёгіяй усыпляюць пільнасьць адсталых колаў рабочае клясы, у адказ на маўчаньне лідэраў правых апартуністых—Бухарына, Рыкава і Томскага—маўчаньне, якое фактычна ажыўляецца сьпаланам салідарызацыі з актывізацыяй дзейнасьці фракцыйных груп унутры партыі (Сырцоў, Ламінадзэ, Шацкі і інш.)—**мы ўступаем у рады КП(б)Б і аддамо сваю сілу справе змаганьня за сацыялізм.**

Мы выклікаем старых рабочых, перадавых ударнікаў усіх прадпрыемстваў Фрунзаўскага РК пасьледаваць нашаму прыкладу і ўліцца ў рады КП(б)Б.

Няхай жыве Камуністычная партыя!
Няхай жыве рабочая кляса!

Малгацкая, вытворчы стаж—16 г., Легчын—5 г., Рольбіна—29 г., Лаксін—25 г., Лямбовіч—8 г., Файвышаў—17 г., Дворкін—19 г., Фурман—16 г., Файгенбоген—16 г., Рутман, Грэчавік, Гейт—20 г., Левін—20 г., Пляўс—10 г., Малашчэнка—16 г., Генлавоцкі, Леках—24 г., Спэктар—13 г., Сабавінскі—25 г., Обукаў—22 г., Цыпкін—37 г., Кантаровіч—12 г., Кабако—16 г., Сьвірноўскі—25 г., Коўнэр—21 г., Сарноў—20 г., Квінтман—25 г., Моніч—30 г., Канцовіч—33 г., Розаў—35 г., Бэйненсон—14 г., Варкалаў—11 г. і Лапідус—18 г.

Тав. Бейненсон, рабочы ф-кі «Кастрычнік», уступіў у партыю

Міжзборавай— ударныя тэмпы

ЦЭНТР РАБОТЫ—САЎГАС І КАЛГАС

„Работа паміж зборамі павінна лічыцца аднэй з асноўных умоў, якія забясьпечваюць стварэньне баяздольных часьцей. Адсутнасьць міжзборавай работы вядзе да небясьпекі ня толькі развучыцца і забыць засвоенае, але і разваеніцца. Небясьпеку гэту трэба своячасова папярэджваць“. (ФРУНЗЭ).

На вышэйшую ступень

Міжзборавая работа мае сваёй асноўнай задачай узмацненьне тэрбудаўніцтва РСЧА. На гэтым важнейшым вучастку баявой работы справа стаіць слаба, калі не сказаць зусім дрэнна.

Чырвонаармеец - тэрытарыяльнік на зборах (у лягерах) атрымлівае добрую падрыхтоўку, але нам трэба, каб пераменьнік паміж прызывамі ў лягеры не забываў ваенай справы, а працягваў не ўзмацняць і нарашчваць.

РВС і Палітуправа ВВА далі тэрчасьцям выразную дырэктыву аб разгортваньні міжзборавай работы ў бягучым навучальным годзе. Паліторгановы тэрчасьцей, разам з парткомамі на мясцох, абавязаны распрацаваць дэталёвы плян міжзборавай работы, мабілізаваўшы актыўнасьць усіх грамадзкіх арганізацый, усяго працоўнага насельніцтва на справу аўладаньня ваенна - палітычнай работы сярод пераменьнікаў, запрызыўнікаў і працоўнага насельніцтва, мабілізаваўшы і арганізаваўшы актыў з пераменьнікаў і запрызыўнікаў, як перадавікоў сацыялістычнага перабудаваньня вёскі.

Вялізарныя посьпехі ў справе рэканструкцыі сельскай гаспадаркі на аснове індустрыялізацыі і калектывізацыі патрабуюць ад нас перабудаваньня міжзборавай работы. **Цэнтральным месцам работы будзе зьяўляцца калгас і саўгас.**

Саўгасы і калгасы лепш дазволяць вырашыць і арганізацыйныя формы падразьдзяленьня: разьдзелаў, рот і батарэй, не гаворачы ўжо аб паляпшэньні і матар'яльнага боку.

Перад вайсковымі часьнямі настаўлена важнейшая задача, дабіцца бесьперабойнай сувязі з пераменьнікамі, бязупыннага ўплыву на яго рознымі формамі масавай палітычнай работы, улічваючы абвастрэньне клясавага змаганьня. Пры вывучэньні раёну камплектаваньня, партыйныя арганізацыі і начсклад часьцей павінны ўважліва сачыць за сацыяльнымі зрухамі ў вёсцы пры разьвіцьці калектывізацыі, і сваю работу і кіраўніцтва будаваць в улікам асаблівасьцей у адносінах калгасьнікаў і адзінасобнікаў, прымаючы рашучыя меры супроць грасочваньня ў армію клясавага чужога элементаў.

Якасьць міжзборавай работы будзе залежыць ад таго, наколькі здолеем дабіцца рашучага павароту тварам да пераменьніка партарганізацый часьцей, начскладу і асабліва партыйных ячэек, арганізаваўшы бязупынную работу па раёнах. Гэта, па-першае, а па-другое, трэба дабіцца **рашучага пералому ў мясцовых партыйных, савецкіх і прафэсыйных органах**, замацаваўшы работу пляхам сумеснай распрацоўкі пляну работ і правядзеньня кантролю з боку РК і РКК і прадстаўніка вайсковай часьці, арганізуючы тройкі, практыкуючы, як правіла, пастаноўку дакладаў у мясцовых партыйна-савецкіх органах, калгасах і саўгасах.

Посьпех міжзборавай работы таксама будзе залежаць і ад **матар'яльнай забясьпечанасьці:** адвод памяшканьняў, забясьпечэньне ваенна-палітычнай літаратурай, вайсковымі куткамі, падручнікамі, зброяй, наладжаньне ціру. На усё гэта патрэбны поўныя сродкі, вострае пуску якіх неабходна дабіцца ў плянавым парадку ад РВК, адлічэньняў з сум культфондаў саўгасаў, калгасаў і інш. зборaў. Калі гурткі ваенных ведаў, вайсковыя гурткі на заводах і фабрыках маюць выстарчальную колькасьці падручнікаў, дык зусім дрэнна стаіць справа ў вёсцы, дзе гэту справу трэба падцягнуць.

На аснове ўзрастаючай індустрыі, Чырвоная армія з кожным годам усё больш аснашчаецца тэхнікай і тэхнічнымі сродкамі барацьбы. Перспектывы гэтыя на бліжэйшыя два гады вялізарныя. Матор, які ўсё больш укараняецца ў армію, робіць пераварот у не мэтадах барацьбы і падрыхтоўкі. Чырвоная армія з кожным годам павінна атрымліваць больш кадраў тэхнічна навучаных людзей, якія добра знаёмы з матэрам. Вывучэньне тэхнічных сродкаў барацьбы, знаёмства з матэрам, яго работай, уменьне даглядаць за машынай—ёсьць адна з важнейшых задач, вырашыць якую ўжо ня цяжка ў горадзе на прадпрыемствах і МТС. Забясьпечэньне калгасаў і саўгасаў трактарамі і аўтамабілямі павінна быць шырока выкарыстана для навучаньня прапоўных.

Адным з магутных вагароў пасьпяховасьці міжзборавай работы будзе **спаборніцтва і ўдарніцтва.** Плян павінен быць даведзен да байца. Арганізуючы **сустрэчны прамфінплян**, выкарыстоўваючы актыўнасьць чырвонаармейцаў, іх прапановы, праводзячы агляды прадрук, бязьлітасна крытыкуючы нашы недахопы, мы здолеем у гэтым годзе дабіцца рашучага пералому ў міжзборавай рабоце і заняцьці прапоўных.

ЛАКЦІЁНАЎ.

Папярэдзім зрывы

Пастанова Бюро Кастрычніцкага РК КП(б)Б ад 12-XI-30 г.

1. Адзначыць, што ня гледзячы на рад дырэктыў РК аб разгортваньні партвучобы і поўным ахопе ўсіх кандыдатаў, да гэтага часу па пасобных ячэйках маюць месца зрывы партыйнай вучобы без уважлівых прычын і зусім невыстарчальны ахоп кандыдатаў (10-20 проц.).

2. Пасобныя парт'ячэйкі: чыгунка-замест 363, ахоплена вучобай 75 партыйцаў, зав. «Полыня рэвалюцыі»—замест 36, ахоплена вучобай 18, МЦРК—замест 327, ахоплена вучобай 22 у АПШ і БСПШ, ЦІП—замест 30, наведваюць школу 1—3 чал. і тым самым сьвядома ігнаруюць дырэктыву РК аб партвучобе, —ня ўжываюць ніякіх захадаў да таго, каб забясьпечыць наведваньне партшкол партыйцамі, асабліва кандыдатамі, што зьяўляецца зусім недапушчальным.

3. Дні партвучобы займаюцца сходамі і пасяджэньнямі (5 і 9 лістапада зрыў за ніткаў на зав. «Полыня рэвалюцыі»), чым фактычна садзейнічаюць зрыву партвучобы.

САКРАТАРУ ЯЧЭЙКІ ЦІП, ФРАКЦЫЯМ МЯСЦКОМАЎ СЛ. ПУЦІ І ЭКСПЛЕАТАЦЫІ—ПАСТАВІЦЬ НА ВІД.

5. Даручыць культпропу РК разам з бюро парткалектыву МЦРК 16-га лістапада г. г. склікаць закрыты партсход, дзе паставіць пытаньне аб партвучобе.

6. Прапанаваць культпропу РК у тыднёвы тэрмін пераглядзець увесь склад выкладчыкаў і прапагандыстых партшкол, прыцягнуўшы да партыйнай адказнасьці тых, якія зрываюць вучобу без уважлівых прычын. ТАВ. ПРОЙМА (яч. чыгункі) за зрыў партвучобы выклікаць на наступнае бюро РК.

7. Даручыць культпропу правярыць ступень падрыхтаванасьці выкладчыкаў з мэтай замены непадрыхтаваных выкладчыкаў.

Шчыльней згуртуемся вакол ленінскага ЦК

Пазысім ідэёвую стойкасьць кожнага камуністага

Гэтымі днямі адбыўся агульны **сход парткалектыву заводу «Чырвоны Мэталіст»** (Віцебск), на якім быў заслухан даклад сакратара гаркому КП(б)Б **тав. Чычарава** аб унутрыпартыйным становішчы і актывізацыі правых і «левых» апартуністых.

У адзнаваленна прынятай рэзалюцыі сход парткалектыву заўважае:

— Рост сацыялістычнага будаўніцтва выразна пацьвярджае правільнасьць генэральнай лініі партыі. Гэты рост выклікаў шалёнае супраціўленьне клясавага ворага, які імкнецца падарваць ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, сарваць узятыя бальшавікіі тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

Лідэры правага апартунізму—**Бухарын, Рыкаў, Томскі**—сваім маўчаньнем выклікаюць да ажыўленьня і актывізацыі правых і «левых» апартуністых, якія становяцца на шлях двурушніцтва ў змаганьні супроць генэральнай лініі партыі. Агульны сход парткалектыву цалкам і поўнасьцю ўхваляе пастановы ЦКК аб выключэньні з партыйных радоў двурушнікаў і здрадніка партыі—Рутіна, Каўрайскага і інш.

Сход парткалектыву ставіць пытаньне перад бюро калектыву аб неабходнасьці глыбокай распрацоўкі пытаньняў сярод шырокіх партыйных мас, аб варожай ідэалёгіі правых і «левых» апартуністых. Пры распрацоўцы гэтых пытаньняў ня ўхільна мабілізаваць партыйныя масы на змаганьне супроць правых і «левых» апартуністых і прымірэнцаў да ўхілаў ад лініі партыі. Сход заклікае ўсіх членаў і кандыдатаў партыі яшчэ больш згуртавацца вакол ленінскага ЦК УсесКП(б) для бязьлітаснага адпору ўсім, хто імкнецца парушыць адзінства нашай партыі, хто імкнецца аслабіць бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва. **Партыйная арганізацыя «Чырвонага Мэталістага» запэўняе, што яшчэ больш разгорне работу па ўцягненьні ў рады партыі лепшых рабочых —ударнікаў і напружыць усе свае сілы для ліквідацыі прарываў у выкананьні прамфінпляну.**

Змаганьне на два фронты патрабуе ўзмацненьня марксыка-ленінскага выхаваньня шырокіх мас партыйцаў. Таму сход прапануе бюро парткалектыву ўжыць практычныя мерапрыемствы для поўнага вырашэньня гэтай задачы, для забясьпячэньня партыйнае асьветы.

Сход парткалектыву катэгарычна і рашуча асуджае выступленьне **т. Станкевіча** і расцэньвае яго, як антыпартыйнае, накіраванае супроць партыйнага кіраўніцтва. Сваімі заявамі аб тым, што быццам ЦК партыі несвоячасова інфармуе партыйныя масы аб унутрыпартыйным становішчы, Станкевіч уводзіць паклёпы на партыйнае кіраўніцтва.

Спробы партыйнай арганізацыі пастаўціць тав. Станкевіча на шлях выпраўленьня сваіх памылак ні да чога не прывялі, а, наадварот, Станкевіч і далей настойвае на сваіх памылках.

Гэта выразна гаворыць аб тым, што выступленьне Станкевіча не зьяўляецца выпадковым, а што гэта сыстэма погляду, якая ня ажыта ім нават пасьля вымовы за прыналежнасьць да трацкісцкай апазыцыі.

Сход лічыць, што пакінуць і надалей Станкевіча на кіруючай рабоце ў заводзкім камітэце **немагчыма.** Адначасова сход лічыць неабходным за антыпартыйнае выступленьне **вывесьці Станкевіча са складу бюро партколектыву** і справу аб яго партыйнасьці накіраваць у кантрольную камісію.

Няхай жыве Камуністычная партыя!
Няхай жыве рабочая кляса!

Малгацкая, вытворчы стаж—16 г., Легчын—5 г., Рольбіна—29 г., Лаксін—25 г., Лямбовіч—8 г., Файвышаў—17 г., Дворкін—19 г., Фурман—16 г., Файгенбоген—16 г., Рутман, Грэчавік, Гейт—20 г., Левін—20 г., Пляўс—10 г., Малашчэнка—16 г., Генлавоцкі, Леках—24 г., Спэктар—13 г., Сабавінскі—25 г., Обукаў—22 г., Цыпкін—37 г., Кантаровіч—12 г., Кабако—16 г., Сьвірноўскі—25 г., Коўнэр—21 г., Сарноў—20 г., Квінтман—25 г., Моніч—30 г., Канцовіч—33 г., Розаў—35 г., Бэйненсон—14 г., Варкалаў—11 г. і Лапідус—18 г.

Як мы будзем працаваць

Нядаўна адбылася нарада начальніцкага складу **33 АРТПАЛКА** аб міжзборавай рабоце. Па гэтай нарадзе прыняты пастановы аб арганізацыі гэтай работы ва ўмовах калгасаў.

Асноўнай арганізацыйнай адзінкаў у парыяд міжзборавай работы павінна быць «група» пераменьнікаў. Адлегласьць ад цэнтру групы да пераменьнікаў не павінна перавышаць 4-х клм. Старшым групы назначаецца асоба сяродняга, малодшага начальніцкага складу, або лепшы тэрмрмеец-калгасьнік, які жыве ў межах гэтай групы. У групах праводзяцца заняткі адзін раз у 7 дзён ад двух да чатырох гадзін старшым групы, або асобай спрэдніяга ці малодшага начскалду. Міжзборавая работа павінна не спыняцца і летам у часе збору навабранцаў.

Апрача абавязковай групы, пераменьніка трэба ўзяць у работу добраахвотных арганізацый: ячэйкі Асоавіяхіму, гурткі вайсковых ведаў. Цэнтрам бярэйнай ваенцай работы павінен быць **калгас.** Батарэйны вучастак у цэнтры павінен мець вайсковы куток пры калгасе. У батарэйным вучастку павінен быць ня менш аднэй **ячэйкі Асоавіяхіму.** Пажадана пры кожнай ваеннай групе стварыць гурток вайсковых ведаў, якія ўвойдуць члены Асоавіяхіму і калгасьнікі. Пастаноўлена шырока практыкаваць насылку малодшага начскладу, забясьпечыўшы яго прыладамі і падручнікамі для пазазборавай работы. Малодшы начскład павінен добра ведаць вучыць тых, з якім яму прыдзецца працаваць лета.

Драбышэўскі.

З бальшавіцкай непрымірымасьцю змагацца супроць правых і „левых“ апартуністых

На фоне ўсяе вялічасьці ўзрастаючага сацыялізму, на фоне творчай ініцыятывы, якая з нястрымнай сілай рвецца ўперад, і працоўнага гэраізму мас, выключна яркa выяўляецца здрадніцкае аблічча апартуністых як правых, так і «левых», якія прабуюць сарваць пасьпяховае сацыялістычнае наступленьне і павярнуць палітыку партыі ў бок рэстаўрацыі капіталізму.

Выключна яркa выяўляецца іх аблічча імянна зараз, калі грымотным раскатам ажыцьцявіўся ўвесь сьвет два залпы пралетарскай перамогі—**два гады пяцігодкі.**

Разгортвае сацыялістычнае наступленьне на ўсім фронце, максымальнае паляпшэньне тэмпаў індустрыялізацыі краіны на аснове творчага энтузіязму шырокіх мас, забясьпечэньне выкананьня вызначаных плянаў індустрыялізацыі ў шматгадовым тэрміне, паляпшэньне і замацаваньне калектывізацыі сельскае гаспадаркі, ажыцьцяўленьне лёзунгу партыі аб ліквідацыі кулацтва, як класы, на базе суцэльнай калектывізацыі, у найкароткі тэрмін **дагнаць і перагнаць у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны—такава каротная праграма бальшавізму на даным этапе, такава генэральная лінія нашай партыі.**

Гэтаю рашучае наступленьне пралетарыяту, пад кіраўніцтвам партыі Леніна, на капіталістычныя элементы натуральна не магло ня выклікаць супрацўленьня з боку клясавага ворага, не магло ня вынесьці апартуністычных хістаньняў і ў пасобных праслойках іншае партыі.

Посьпехі сацыялістынага будаўніцтва партыі разам з усім пралетарыятам, пад выпрабаваным кіраўніцтвам баявога ленінскага ЦК, забясьпечылі і забясьпечваюць тым, што заўсёды перамагала і перамагае трудасьці, што стаяць на шляху, заўсёды пястомна змагалася і змагаецца з усякімі апартуністычнымі хістаньнямі ў яе радох, выхоўвала і выхоўвае свае рады ў духу тае сьвядомасьці, што ня зьніччэньні ўсякага роду апартунізмаў, не захаваўшы жалезнага адзінства партыйных радоў, нельга прасунуцца ўперад, нельга з посьпехам будаваць сацыялізм.

І ўсякага, хто гэтага не разумее, мы з нагадаю адкідаем ад сябе, каб ня трацінь слоў на гутаркі аб форме сацыялізму». (Ленін).

Вопытам сацыялістычнага будаўніцтва цалкам пацьверджана, што генэральная лінія партыі зьяўлялася адзіна правільнай палітыкай сацыялістычнага наступленьня.

Гэта пацьверджана яшчэ і тым, што «на XVI зьезьдзе партыі ня выявілася ня толькі афармленай апазыцыі, але нават не знайшлося маленькай групы або нават пасобных таварышоў, якія-б лічылі прававерным выясьці тут на трыбуну і заявіць аб няправільнасьці лініі партыі». (Сталін—заключн. слова па палітсправездачы).

Аднак, «апартуністы ўсіх колераў, асабліва правыя, ужываюць новы маноўр, які выяўляецца ў фармальным прызнаньні сваіх памылак і ў фармальнай згодзе з генэральнай лініяй партыі, не пацьверджаючы прызнаньня работай і барацьбой за генэральную лінію, што на справе азначае толькі пераход ад адкрытай барацьбы супроць партыі да скрытай або чаканьне больш спрыяючага моманту для аднаўленьня атакі на партыю». (З рэзалюцыі па справездачы ЦК).

Новая спроба правых і «левых» апартуністых атакаваць генэральную лінію бальшавізму тактыкай стварэньня беспрынцыпнага права-«лявацкага» блёку патрабуе ад кожнага, які ідзе ў нагу з партыяй, непрымірымага змаганьня як з апартуністымі «левага»—контр-рэвалюцыйна-трацкісцкага талкаваньня, так і адкрыта-правага, як найбольш небясьпечнага на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва.

Асноўным моментам плятформы групы, якая прабуе стварыць права-«лявацкі» блёк, зьяўляюцца сьцьвярджэньні аб нерэальнасьці узятых тэмпаў індустрыялізацыі.

Тут можна бачыць яўнае пераплецьцьне правaапартуністычнага панікёрства з трацкісцка-«лявацкімі» перапевамі:

«Шпаркія тэмпы разгортваньня цяжкай індустрыі зьяўляюцца няўхільнай кампэнсацыяй за нашу адсталасьць і навольныя тэмпы ў мінулым» Прабуючы давесьці прымернасьці ўзятых тэмпаў, правыя апартуністы выцягваюць лазманы зэйсаў Троцкага, абвінавачваючы партыю ў «навольных тэмпах у мінулым».

«Пра трацкістых існуе думка, як пра зьвыш-індустрыялістых. Але гэта думка правільна толькі часткова. Яна правільна толькі настолькі, наколькі гутарка ідзе ў канцы **адбудоўчага** перыяду, калі трацкісты сапраўды разьвівалі зьвышіндустрыяліцкія фантазіі. Што датычыць рэканструкцыйнага перыяду, дык трацкісты з пункту погляду тэмпаў зьяўляюцца самымі крайнімі мінімалістымі і самымі пагаднымі капітулянтамі». (Сталін—Палітсправездача ЦК на XVI зьезьдзе).

Іх, апартуністых усіх масьцей, не пераконваюць лічбы росту нашай індустрыі, яны ня бачаць вырастаючых гігантаў, якія да тэрміну выканалі свае пляны будаўніцтва, як і ня бачаць уздыму ўсяго народнае гаспадаркі. Зноў агідны паклёп на партыю, на яе генэральную лінію, на ленінскае кіраўніцтва—ЦК УсесКП(б).

Апартуністы ўсіх масьцей, ня бачаць і ня хочуць бачыць творчай ініцыятывы працоўнага гэраізму мас, яны бессаромна заяўляюць аб тым, што «наглядзецца нейкі ўпалак, амаль што прастрацыі, няма творчай ініцыятывы». Спалохаўшыся сустрэчных плянаў, якія ідуць з цэхаў, замяшаўшыся перад вялічэзным размахам ленінскай волі пралетарыяту і яго партыі, яны прабуюць выявіць ідэю сустрэчнага прамфінпляну, як «ідэю, якая пачынае накрывацца бюракратычнай каростай».

Увесь гэты пэсымізм, безнадзейная замшэлаасьць, уся гэта насьрозь пралежаная чужой ленінскай партыі і пралетарыяту ідэалёгіяй, **установка—характэрныя таксама і ў вырашэньні праблемы сельскае гаспадаркі.**

Алмаўляючы наварот асноўных мас селянства ў бок сацыялізму і затушоўваючы наўмысьля нашыя дасягненьні ў галіне калгаснага будаўніцтва, дасягненьні ў галіне вырашэньня асноўнай праблемы ў сельскай гаспадарцы—**збожжавай праблемы**, правыя апартуністы, выцягнуўшы з трацкісцкага архіву «рамансы» аб тым, што «з сялянскіх сох і сялянскіх ключ, хоць-бы і абагулены, нельга стварыць буйной сельскай гаспадаркі». Што тэмпы нашага калгаснага будаўніцтва «авантурыстычныя», што «нельга сёньня будаваць калгасы на будучых трактарах»—прабуюць стрымаць тэмпы калгаснага будаўніцтва.

Контр-рэвалюцыйныя «прагнозы» як правых, так і «левых» апазыцыянэраў не апраўдаліся, зьявіліся бессаромным паклёпам на партыю, на рабочую клясу, на працоўнае сялянства.

Лёгіка фракцыйнага змаганьня ўсякай апазыцыі супроць бальшавізму прыводзіць апартуністых ня толькі да аб'екта ў лягер контр-рэвалюцыі. І толькі ны лягер, адольны даваць такую характарыстыку нашай палітыкі суцэльнай калектывізацыі сельскае гаспадаркі, дэмакратычных наслутачоў фашызму на СССР.

Новыя вылазкі правых і «левых» апартуністых, якія прабуюць зьяднацца, каб зноў пачаць змаганьне супроць палітыкі партыі і пралетарыяту, няўхільна прывядуць да тых-жа вынікаў, да якіх прывяло змаганьне контр-рэвалюцыйнай трацкісцкай апазыцыі.

«Плятформеныя выступленьні Сырцова, Ламінадзэ і інш. ёсьць публічны сыгнал, паданы імі ўсім апартуністым правых і «левых», ёсьць «лягерны збор» тыпных элементаў для чарговых апартуністычных «маноўраў».

Аднак, няпрывільнымі будуць талкаваньні аб тым, што спробы стварэньня права-«лявацкага» блёку зьнімаюць лёзунг партыі—барацьба на два фронты.

Правы ўхіл застаецца галоўнай небясьпекай, таму што ён «адлюстроўвае небясьпеку ня толькі ад кулацкага, а кулацкая нагорнутага наступленьня і выкарчоўваньня карэньняў капіталізму, зьяўляецца асноўнай небясьпекай у краіне». (Сталін).

Правы ўхіл зьяўляецца галоўнай небясьпекай і таму, што ён, хочуць ці ня хочуць гэтага нарвыя апартуністы, **стаўсьцягам антысавецкіх шкодніцкіх сіл**, ён аб'ектыўна вядзе за сабою кандрацьеўчыну, **становіцца рупарам ўнай контр-рэвалюцыі ў форме «прамысловай партыі».**

Разам з тым, руйнуючымі павінны быць удары партыі і па трацкісцкіх і паўтрацкісцкіх поглядах і рэцыдывах. Удары партыі павінны быць накіраваны і па прымірэнцкіх настроях як да правых, так і «левых» апартуністых, бо прымірэ

У ТЭРМІН, НІ НА АДНО БЕРВЯНО МЕНШ

Мацней удар па апартуністьме на практыцы

Мінуў кастрычнік і першая дэкада лістапада, а становішча на лесазагатоўках застаецца трывожным. Запазычанасьць песапрамысловасьці па будаўнічых матар'ялах для буйных будаўніцтваў, а таксама па дровах для пралетарскіх цэнтраў увесь час расьце. Патрабуецца НЕАДКЛАДНЫ ПЕРАЛОМ У ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВАЎ па лесазагатоўках.

Адзэй з галоўнейшых прычын прарываў па лесазагатоўках зьяўляецца АДСУТНАСЬЦЬ РАБОЧАЙ І ГУЖАВОЙ СІЛЫ. Ня гледзячы на неаднаразовыя паказаньні ўраду БССР аб неабходнасьці самай шырокай дапамогі ўсіх савецкіх арганізацый лесазагатоўкам, на мясцох НЕДАПУШЧАЛЬНЫЯ НАГЛЯДАЮЦЦА АДНОСІНЫ З БОКУ НЕКАТОРЫХ РАЙВЫКАНКОМАЎ І СЕЛЬСАВЕТАЎ гэтаму важнейшаму пытаньню нашага гаспадарчага жыцьця. Кожны прапушчаны дзень гэтага ўдарнага кварталу зьяўляецца УДАРАМ ПА ВЫКАНАНЬНІ ПЛЯНУ ЛЕСАЗАГАТОВАК, а тым самым льле ваду на млын нашых клясавых ворагаў і іх агентуры ў партыі—правых і «левых» апартуністых. Так і ня інакш МЫ МОЖАМ І ПАВІННЫ РАСЦЭНЬВАЦЬ работу савецкага апарату, зрываючага лесазагатоўні.

На жоль, трэба адзначыць, што адсутнасьць увагі лесазагатоўкам з боку райвыканкому мае НЕ АДЗІНКАВЫЯ ВЫПАДКІ. У большасьці выпадкаў РВК пытаньні аб лесазагатоўках ставілі і ста вяць у «бягучых справах» і, як гэта звычайна здараецца, у канцы пасяджэньняў зьнімаюць з парадку дня.

Перад намі тоўстая папка розных матар'ялаў, тэлеграм, рапартаў, данясеньняў і г. д., якія гавораць аб агідненьшых адносінах райвыканкомаў да справы лесазагатовак.

ХОЙНІЦКІ РВК сваімі палазінчатымі пастановамі аб разьмеркаваньні рабсілы з мясцовага насельніцтва, сарваў у кастрычніку работу па лесазагатоўках у радзе сельсаветаў. Такое-ж самае становішча мы маем пакуль што і ў лістападзе.

КОЙДАНАЎСКІ РВК увесь час адкладвае канчатковае давядзеньне пляну лесазагатовак да вёскі, знаходзячы розныя прычыны.

БАГУШЭЎСКІ РВК сарваў лесазагатоўкі канчаткова. У Станкоўскім сельсавеце, дзе работа па лесазагатоўках разьвівалася нармальна, прыехала брыгада Багушэўскага РВК і катэгарычна заявіла, што пакуль ня будзе скончана работа па загатоўках збожжа, бульбы і сена, да таго часу ні адна фурманка ў лес не паедзе. Брыгадзе запрапанавана забраніваць хоць-бы 16 фурманак для вывазкі асіны, але ўпартыя брыгадзіры не хацелі нават аб гэтым і слухаць. Стар шыня-ж РВК, да якога па гэтым пытаньні зьвярнуўся прадстаўнік леспрамгасу, проста адказаў, што лесазагатоўкі можна праводзіць узімку, а зараз ён заняты больш важнымі пытаньнямі.

САМАХВАЛАВІЦКІ РВК адмовіўся ня толькі прымацаваць рабсілу поўных сельсаветаў да лесазагатовак, але нават адмовіўся пастаўіць гэта пытаньне на пасяджэньне прэзыдыуму РВК. Калі-ж прадстаўнікі Нёманскага леспрамгасу энэргічна гэтага патрабавалі, старшыня РВК запрапанаваў ім прадставіць афіцыйныя спраўкі аб тым, што сельсаветы адмаўляюцца браць удзел у лесазагатоўках.

РАСОНСКІ, ДРЫСЕНСКІ, БОРКАВІЦКІ, АСЬВЕЙСКІ І ЕЛЬСКІ РВК адмовіліся давесьці плян лесазагатовак да вёскі і двара.

БЯРЭЗІНСКІ РВК прымацаваў да лесазагатовак рабсілу толькі трох сельсаветаў, што рэальна азначае зрыў лесазагатовак гэтага кварталу ў раёне.

Гэты сьпіс можна было-б падоўжыць, але для кожнага ясна, што такія адносіны з боку раду РВК ёсьць ні што іншае, як апартуністычныя адносіны да баявых гаспадарчых задач—апартунізм на практыцы.

Але адначасова можам прывесьці цэлы рад фактаў процілеглага характару, калі РВК становяцца на чала барацьбы за лес, за поўнае выкананьне пляну лесазагатовак. Лепшым прыкладам у гэтых адносінах зьяўляецца ПЛЕШЧАНІЦКІ РВК, які зьяўляўся ініцыятарам сацыялістычнага спаборніцтва між сельсаветамі і леспрамгасамі ў раёне. Паводле сацыялістычнага дагавору, сельсаветы гэтага раёну абавязаліся правесьці шырокую растлумачальную работу па выкананьні пляну лесазагатовак да сельсаветаў і арганізаваць 4 чырвоныя абозы раёну і ўсераённы дзень ударніка па лесазагатоўках. Сельсаветы абавязаліся таксама арганізаваць сталыя брыгады—арцелі на ўвесь лесараспрацоўчы сэзон з кожнага сельсавету па 250 чал., арганізаваць на лесавучастках ліквункты і забясьпечыць іх кіраўнікамі.

Практыка ПЛЕШЧАНІЦКАГА РВК павінна быць прыкладам для рэшты раёнаў, як па-баявому трэба арганізоўваць лесазагатоўкі, як савецкі апарат, ня гледзячы на паклёпы правых і «левых» апартуністых, можа працаваць бальшавіцкімі тэмпамі.

Э. Л.

КУЛЬТЭСТАФЭТА

Забясьпечыць карэнны зрух

ЧАЦЬВЕРТЫ МАРШРУТ УСЕБЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТЭСТАФЭТЫ ПРАДУГЛЕДЖВАЕ ПРАВЕРКУ ТАГО, ЯК КУЛЬТУРНА-МАСАВАЯ РАБОТА АДЛЮСТРОЎВАЛА НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ БАРАЦЬБУ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ. МАРШРУТ ТАКСАМА МАЕ МЭТАЙ ДАПАМАГЧЫ ПАСТАНОЎЦЫ КУЛЬТУРНА - ВЫТАВОЙ РАБОТЫ Ў ЗАВОДЗКІХ ДАМОХ, КАЗАРМАХ, БАРАКАХ.

АБ ЧЫМ СЬВЕДЧАЦЬ НАДРУКАВАНЫЯ СЁНЬНЯ Ў «ЗЬВЯЗДЗЕ» МАТАР'ЯЛЫ З ГОМЕЛЮ І З АСІНСТАЎКІ?

ЯК ГЛЕДЗЯЧЫ НА ТОЕ, ШТО XVI ЗЬЕЗД ПАРТЫІ СКАЗАЎ З УСЁЙ ВЫРАЗНАСЬЦЮ:

«УСЯКАЯ НАЛІТАСЬВЕТНАЯ І КУЛЬТУРНАЯ РАБОТА ПАВІННА ВЫЙЦЬ НАКІРАВАНА Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ НА РАЗЬВІЦЬЦЁ САЦЫЯЛІСТЫЧНА СЬВЯДОМЫХ АДНОСІН ПРАЦОЎНЫХ ДА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВЫТВОРЧАСЬЦІ, ПАДКРЭСЬЛЬНЫЦЬ ТЫМ САМЫМ ВЯЛІЗРАНУЮ РОЛЮ ЯЕ

МНОГІЯ ФІБРЫЧНА - ЗАВОДЗКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ ЯШЧЭ НЕ ПЕРАКЛЮЧЫЛІСЯ АДПАВЕДНА НОВЫМ ЗАДАЧАМ, ЯШЧЭ ПАКІДАЮЦЬ У БАКУ ПЛЯНАВУЮ КУЛЬТУРНА-МАСАВУЮ РАБОТУ.

СТАЎКУ ПААСОБНЫХ ФАВЗАЎКОМАЎ НА САМАЦЁК АБО ІМКНЕНЬНЕ УЗВАЛІЦЬ МАСАВУЮ РАБОТУ Ў ЦЭХАХ ПА АДМІНІСТРАЦЫЮ (ЦАГЕЛЬНЯ ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА) ПЕЛЬГА РАСЦЭНЬВАЦЬ ІНАКШ, ЯК ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНУЮ НЕДАЛІЧЭНКУ КУЛЬТ.-МАСАВАЙ РАБОТЫ.

КОЖНЫ КРОК НАБЛІЖАЕ НАС ДА ФІНІШУ.

З ГОНАРАМ ПРАНЕСЬЦІ ДА І СТУДЗЕНЯ 1931 ГОДУ СЬЦЯГ ЭСТАФЭТЫ ПРАЗ КОЖНЫ АГРЭГАТ, КЛЮБ, ЗЬМЕНУ РАБОЧЫХ, ДАБІЦЦА КАНКРЭТНЫХ НАЛЯШЧЭНЬНЯЎ КУЛЬТУРНА-МАСАВАЙ РАБОТЫ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ — НЕАДКЛАДНАЯ І ПЕРШАСРЭДНАЯ ЗАДАЧА ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ І ФАВЗАЎКОМАЎ.

У тылу

Культэктар гомельскага гарпрафсавету разам з брыгадаю ЦСПСВ мабілізуе культурныя сілы і усю савецкую грамадзкасьць на агляд культурна-масавай работы на прадпрыемствах Гомелю.

На заводзе «Пралетары» агляд ужо распачаўся. Створан культштаб. Дзьвюх камсамольскія ячэйкі абвясьцілі сябе мабілізаванымі на агляд культамасавай работы, адбыліся сходы актыву і рабочых, арганізаваны брыгады.

На заводзе імя Ланцуцкага маса рабочых таксама ўцягваецца ў агляд.

На некаторых прадпрыемствах створаны культпалітасьветы. У Нова-Белічы пры фабрыцы «Вэзуві» для агляду мабілізавана брыгада настаўнікаў.

Побач з гэтым на многіх прадпрыемствах проста недаацэньваюць работы на агляде: выяўляюцца моманты правааппортуністычнай бязьдзейнасьці і гапобнага ўхіленьня ад агляду. Культэстафета не прасякнула ва многія прадпрыемствы ў Гомелі.

На «Чырвоным хэміку» на сходзе, дзе стаяў даклад аб культ-масавай рабоце, было толькі 40 чал., а пад канец сходу засталося 20...

У культэктарох некаторых заўкомаў існуе анархічнасьць. Абмяркоўваючы пытаньні прамфінпляну, пасобныя работнікі баяцца ставіць пытаньні культмасавай работы, каб «ня змазаць пытаньня прамфінпляну», і зусім не клапоцяцца, каб увязаць гэтыя задачы. Культ-масавая работа ідзе, такім чынам, самацёкам.

На цагельні імя Дзяржынскага культэктар заўкому перадаў працу па агляде культ-масавай работы адміністрацыі. Заўком даручыў ёй перш за ўсё правесьці гутаркі з рабочымі ў часе сьнеданьня. Адміністрацыя адмовілася. Але культэктар заўкому «ня ўступіў»: на сваім спэцыяльным насяджэньні ён зафіксаваў гэты «факт» у пратаколе, а аб практычным правядзеньні агляду зусім забыўся...

На заводах, дзе працуюць тысячы рабочых, не відзецца ніякай культмасавай работы. На «Пралетары» з-за адсутнасьці памяшканьня няма ніякіх гурткоў, заўвом пават і ня думае ставіць іх.

Я. КАВАЛЁНАК.

ЗМАГАЦЦА З КУЛАЦТВАМ І ЯГО АГЕНТУРАЙ У ПАРТЫІ—ПРАВЫМІ І „ЛЕВЫМІ" АПАРТУНІСТЫМІ, З БЮРАКРАТАМІ І ШКОДНІКАМІ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПРАГРАМЫ ЛЕСАЗАГАТОВАК

ЗА БАЯВЫ АПАРАТ ДЛЯ БАЯВЫХ ЗАДАНЬНЯЎ

У сыстэме мерапрыемстваў на карэнай перабудове лясное гаспадаркі і лясное прамысловасьці адно з першых месц займае пытаньне аб формах арганізацыі гаспадаркі і прамысловасьці. Па-колькі найбольш мэтазгодне і поўнае прамысловае выкарыстаньне драўніны непарыўна зьвязана з правільным вядзеньнем лясное гаспадаркі, таму было прызнана мэтазгодным поўнае арганізацыйнае аб'яднаньне лясное гаспадаркі і лясное прамысловасьці, як адзінай галіны народнае гаспадаркі. Выходзячы з гэтага прынцыпу, была створана рэарганізацыя і на пастанове ўрадавых органаў лясы былі перададзены прамысловасьці і ў ВСНГ згуртавана ўся лясная гаспадарка і лесапрамысловая справа і пабудавана адпаведная сыстэма кіраваньня на базе адзінага плянавага апэратыўнага кіраўніцтва.

Праведзенай рэарганізацыяй ахоплена ўся сыстэма лясного і лесаэксплёатацыйнага апарату зьверху да нізу. Створаны новыя зьвяны нізавога апарату. Замест лесазагатоўчых раённых і вучасткаў «Лесбелу» (асноўнага лесазагатоўцы ў БССР) і лясьніцтваў НКЗ арганізаваны леспрамгасы. Леспрамгас—савецкая фабрыка драўніны-зьяўляецца найбольш рацыянальнай арганізацыйна-гаспадарчай формай па будовы нізавога зьвяна лясное гаспадаркі і лясное прамысловасьці, якая ахапляе ў сваёй дзейнасьці ўсё кола работ па лясной гаспадарцы ад лесаднаўленьня да высечкі лесу.

Зусім зразумела, што пасьпяховасьць рэарганізацыі, а значыцца і выкананьне вытворчых заданьняў залежыць ад таго, наколькі хутка і правільна будзе фактычна рэарганізаваны нізавы апарат, наколькі будзе сьцёрта штучная грань паміж лясной гаспадаркай і лясной прамысловасьцю, наколькі хутка апараты былых лясного ведамства і лясное прамысловасьці (Лесбелу) будуць скалочаны ў адзіны аднаўлены апарат леспрамгасу, далкам накіраваны на выкананьне задач па забесьпячэньні ўсё узрастаючых патрэбнасьцяй народнае гаспадаркі ў драўніне.

З моманту выпясеньня пастановы СНК БССР ад 23-VII-30 г. прайшоў даволі доўгі тэрмін і калі яшчэ несвячасова гаварыць аб эканамічным і вытворчым эфэкце арганізацыі леспрамгасаў, дык ужо можна паставіць пытаньне—у якім становішчы знаходзіцца сам апарат леспрамгасаў, ці ня ёсьць стварэньне леспрамгасаў проста зьмена шыльды старога зьместу, ці выкананы дырэктывы партыі і ўраду па гэтым пытаньні.

Што з сябе ўяўляе апарат леспрамгасаў і вучлеспрамгасаў? Гэта былыя работнікі лясьніцтваў НКЗ і раёнаў Лесбелу. У сваёй апэрацыйнай работе гэтыя людзі заўсёды сутыкаліся і гэта магло стварыць упэўненасьць, што апарат наладзіцца. Але, відаць, вельмі моцныя яшчэ старыя чыноўніцкія традыцыі, яшчэ цісьне косная і кансэрватызм, яны зьяўляюцца галоўнейшай перашкодай на шляху арганізацыі сапраўды новага апарату. Чыноўнікі з лясное гаспадаркі і кансэрватыўныя элементы, якія прайшлі даровалюцыйную прыватна-капіталістычную школу работнікаў лясное прамысловасьці, цягнуць апарат назад. Па гэтай спрыяючай глебе расьцьвітае яўны антаганізм паміж работнікамі, які ў радзе выпадкаў пераростае ў простую нагарднасьць інтарэсамі асобных частак работы леспрамгасаў. Наглядаецца недавучэт работнікамі лясное прамысловасьці важнасьці лесагаспадарчых работ і работнікамі па лясной гаспадарцы—значэньня і важнасьці лесаэксплёатацыйных работ. Гэтаму садзейнічае тое, што загадчыкамі вучлеспрамгасаў у пераважнай большасьці зьяўляюцца былыя лясьнічыя, якія часта задаюць однаведны тон. Некалькі прыкладаў: у вучастках Чачэрскага леспрамгасу, пры складаньні сьпісаў на работнікаў, складаліся асобна сьпісы на работнікаў па лясной гаспадарцы і асобна на работнікаў па лесазагатоўках, і апошнія, як-бы ставіліся асобна. У Хойніцкім леспрамгасе яўна непармальнае становішча, калі нам. дырэктара па лесазагатоўках амаль ізаляваны, яму ня створаны спрыяючыя ўмовы для работы, а ўсе работнікі згуртаваліся вакол дырэктара леспрамгасу—б. інспэктара лясоў. Часамі даходзіць літаральна да анэкдотаў. У адным леспрамгасе аб'ездчык адмовіўся падвезьці на сваім кані дзесятніка, матывуючы тым, што дзесятнік работнік не лясьніцтва, а Лесбелу і ён ня абавязаны вазіць яго на «казённым кані».

Дзякуючы гэтаму непармальнаму становішчу, да гэтага часу не наладжана справа выкарыстаньня работнікаў па лясной гаспадарцы на лесараспрацоўках і наадварот. У прыватнасьці работнікі на лясной гаспадарцы гавораць так: «Я сваю справу зрабіў, а астатняе мяне не датычыць», хаця вольнага часу застаецца вельмі многа. Нельга забывацца на тое, што выкарыстальне ўсіх работнікаў па ўсіх відах работ ў лесе, ва ўмовах вострага недахопу тэхнічных кадраў і беднасьці леспрамгасаў людзьмі, набывае вельмі важнае значэньне.

Які са сказанага можна зрабіць вывад? Поўная рэарганізацыя і злучэньне апаратаў не праведзены, а выкананы фармальна. Апарат леспрамгасаў далёка яшчэ не скалочаны, фактычна па сутнасьці, работа па рэарганізацыі далёка ня скончана.

Таму неабходны, энэргічныя мерапрыемствы ў справе завяршэньня рэарганізацыі апарату, неабходна растлумачальная работа сярод саміх нізавых работнікаў. Ні ў якім выпадку нельга забывацца пра тое, што дапушчэньне моманту, перашкаджаючых бесьперабойнай работе апарату леспрамгасаў, перазуменьне шкодлівасьці іх і прымірэнцкія адносіны да гэтага—ёсьць правы апартунізм на практыцы і па посьбітах гэтых права-апартуністычных тэндэнцый трэба ўдарыць мацней.

Н. УГАРАЎ.

ТРЫВОЖНЫЯ ЛІЧБЫ

Паводле вестак Лесбелу, на 11 лістапада плян загатовак асобнага кварталу кастрычнік-сьнежань выкананы па будаўнічых матар'ялах на 13,4 проц., па дровах—5,1 проц. Па вывазцы выканана: па будаўнічых матар'ялах — 2, 1 проц. і па дровах—2,1 проц. пляну асобнага кварталу.

На першым месцы па загатоўцы ідуць наступныя леспрамгасы: Чэчанскі, Рэчыцкі, Гомельскі, Магілеўскі, Друцкі. Аршанскі, Горацкі і Бярэзінскі.

На апошнім месцы ідуць Глускі, Барысаўскі, Плешчаніцкі, Боркавіцкі, Дрэтуньскі, Бешанковіцкі, Віцебскі.

Асабліва дрэнна стаіць справа з вывазкай у Барысаўскім, Менскім, Друцкім, Аршанскім, Горацкім, Нараўлянскім і Уборцкім леспрамгасах.

Гэтыя лічбы б'юць трывогу.

ПАТРЭБНЫ РАШУЧЫЯ МЕРЫ

Адзэй з важнейшых прычын марудносьці тэмпаў лесазагатовак зьяўляецца непаладжанасьць забесьпячэньня рабочых загатовак прадуктамі і прамтаварамі. Загатоўчыя арганізацыі і спажывецкая кааперацыя БССР да гэтага часу ня выканалі дырэктыў партыі і ўраду ў гэтым напрамку. Сыстэма Белкаапсаюзу ня здолела арганізаваць правільнае і сыстэматычнае рабочае забесьпячэньне.

Фармальна ўсё ў «поўным парадку».

19 кастрычніка Лесбел заключыў з Белкаапсаюзам дагавор, паводле якога «Белкаапсаюз абавязваецца арганізаваць на працягу 1930-31 году, праз сыстэму спажывецкай кааперацыі, забесьпячэньне рабочых і служачых, занятых на дрова-лесазагатоўках і сплаўных апэрацыях ва ўсіх раёнах БССР хлебафуражом (у тым ліку і сенам), прадуктамі харчаваньня, а таксама прамтаварамі»...

Але, на жаль, усе гэтыя мерапрыемствы пакуль што застаюцца толькі на паперы. На справе-ж становішча з забесьпячэньнем не палепшылася. Лепшай ілюстрацыяй могуць служыць шматлікія тэлеграмы з месц аб катастрафічным стане рабочага забесьпячэньня.

З Полацкага раёну тэлеграфуюць: «Узьдзейнічайце на Белкаапсаюз у адносінах забесьпячэньня харчовым фуражом. Спажывецкая кааперацыя адмовілася ад забесьпячэньня лесазагатовак».

Аналёгічныя тэлеграмы паступаюць з Плешчаніцкага, Хойніцкага, Боркавіцкага і іншых раёнаў.

У мінулым годзе плян арганізацыі сталовых для рабочых лесазагатовак быў поўнасьцю правалены. Даволі сказаць, што па ўсіх раёнах лесазагатовак у БССР было арганізавана ўсяго... 10 сталовак.

У гэтым годзе амаль такі-ж малюнак. Ужо звыш 4-х месяцаў як галавацяць а Лесбелу і Белкаапсаюзу вядуць ведамственыя спрэчкі аб тым... павінен ці не павінен Лесбел прадстаўіць Белкаапсаюзу сьпіс пунктаў загатовак, дзе трэба арганізаваць сталоўкі. Лесбел катэгарычна адмаўляецца зрабіць гэта.

Толькі два тыдні назад, пасьля ўмяшальнасьці НК РСІ, Лесбел, нарэшце, прадставіў... неадкладны арыентовачны сьпіс пунктаў. Паводле гэтага сьпісу, на лесазагатоўках БССР павінна быць арганізавана 120 сталовак.

Сталоўкі павінны былі быць арганізаваны на працягу сямі дзён у памяшканьнях, якія пункты Лесбелу абавязаліся прадаставіць спажывецкім т-вам.

Аднак, да гэтага часу да арганізацыі сталовых амаль нідзе яшчэ не прыступлена. Наадварот, паступаюць весткі, што арганізацыя сталовых зрываецца з-за адсутнасьці памяшканьняў. Заслаўскае, Лагойскае, Астрашыцка-Гарадзецкае і іншыя аддаленьні Лесбелу не паклапаціліся аб памяшканьнях для арганізацыі сталовак. Яны адкладваюць гэту справу з тыдня на тыдзень. У выніку пляну арганізацыі сталовак пагражае лёс леташніх плянаў.

***

Патрэбны рашучыя меры для палепшэньня рабочага забесьпячэньня на лесазагатоўках. Лесбел і Белкаапсаюз павінны аддаць максімум увагі гэтай важнейшай справе. Дырэктывы партыі і ўраду павінны быць выкананы поўнасьцю.

С. Г—н.

Лепшых камсамольцаў на лесазагатоўкі

Камсамол Беларусі павінен стаць на чале арганізацыі працоўнай моладзі пад кіраўніцтвам партыі і даць, у першую чаргу са сваіх радоў, лепшых камсамольцаў для сталай работы на лесазагатоўчым фронце.

Пасьпяховае выкананьне лесазагатовак будзе зьяўляцца адным з вымярэньняў нізаў у правядзеньні сапраўднага паваротту «тварам да вытворчасьці». На выкананьне лесазагатовак павінен быць мабілізаваны увесь камсамол, а пад яго кіраўніцтвам, — уся батрацка - налгасная і бядняцка - серадняцкая працоўная моладзь.

Паводле вопыту мінулага году, плян лесазагатовак выконваўся з посьпехам там, дзе раённыя камітэты і ячэйкі камсамолу сваячасова правялі растлумачальную работу сярод камсамольцаў і сярод працоўнага сялянства аб палітычнай сутнасьці правядзеньня лесазагатовак. У гэтых мясцох ушчэнт разьбівалася ўсл кулацкая агітацыя і бесьперабойна выконваўся лесазагатоўчы плян. Таму, зараз адна з важнейшых задач — гэта сталае растлумачэньне як сярод камсамольцаў, так і сярод усёй батрацкай, калгаснай і бядняцка-серадняцкай моладзі і дарослага працоўнага сялянства палітычнай сутнасьці лесазагатоўчай кампаніі. Гэта растлумачэньне павінна быць зьвязана з канкрэтным давядзеньнем лесазагатоўчага пляну да сяла, вёскі, без чаго немагчыма арганізацыйнае правядзеньне гэтай кампаніі.

Бюро ЦК пастанавіла мабілізаваць 1.000 чал. камсамольцаў на лесазагатоўкі. Гэта тысяча павінна зьвяцца ўдарным ядром, вакол якога павінны быць згрупаваны ўсе лесарубы з тым, каб забясьпечыць камсамольскім ядром усе арцелі. Камітэты і ячэйкі павінны зараз-жа прыступіць да адбору гэтых камсамольцаў. Трэба зараз-жа пры камітэтах і ячэйках арганізаваць групы садзейнасьці, у якіх можна прыцягваць і беспартыйную працоўную моладзь. Гэтыя групы павінны будуць сачыць за ўсёй работай, якая-б дапамагала ўсім арганізацыям у выкананьні пляну лесазагатовак.

Другая задача ў правядзеньні лесазагатовак — гэта арганізацыя работы сярод саміх лесарубаў, бо ад ступені работы будзе залежыць і сваячасовае выкананьне пясного прамфінпляну. Таму трэба абавязкова ў кожнай арцелі лесарубаў стварыць камсамольскае ядро, якое павінна адказваць за працу данай арцелі. Камсамольцы павінны ўцягнуць усіх лесарубаў у сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, растлумачыўшы сутнасьць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, як мэтад сацыялістычнай арганізацыі працы.

Трэцяя задача — гэта правядзеньне палітвыхаваўчай работы сярод лесарубаў. Ад таго, наколькі будуць растлумачаны лесарубам задачы партыі, будзе залежыць пасьпяховае выкананьне пляну лесазагатовак. Трэба забясьпечыць тыя месцы, дзе будуць знаходзіцца лесарубы, адкрыцьцём чырвоных куткоў і выпісаць адпаведную колькасьць газэт; праводзіць гутаркі аб значэньні сваячасовага выкананьня прамфінпляну і аб цеснай сувязі пясное гаспадаркі з усёй буйной прамысловасьцю і нанава пабудаванымі заводамі. Трэба наладзіць работу так, каб лесаруб адчуваў, што ён стаіць на вялікай варце сацыялістычнага будаўніцтва і што ад яго таксама залежыць пасьпяховае выкананьне прамфінпляну.

Неабходна зараз-жа ячэйкам ЛКСМБ, камітэтам, разам з атрадамі «лёгкай кавалерыі», праверыць падрыхтаванасьць кааперацыйнай арганізацыі з пункту гледжаньня сваячасовага і бесьперабойнага забесьпячэньня прадуктамі рабочых, якія працуюць на лесазагатоўках.

Адным з белучых месц у выкананьні пляну лесазагатовак зьяўляецца несвячасовая адгрузка песаматар'ялаў. Транспарт і да гэтага часу яшчэ адстае. Транспартныя ячэйкі павінны стаць на чале барацьбы за сваячасовае і поўнае выкананьне пляну па адгрузцы песаматар'ялаў.

Пасьпяховае выкананьне лесазагатовак будзе іменна залежыць ад таго наколькі будзе праведзена сваячасовае растлумачэньне, наколькі правільна будуць расстаўлены сілы і наколькі будзе даны рашучы адпор усім кулацкім і падкулачным элемэнтам і іх агентам —правым апартуністым.

Ітак, камсамольцы і працоўная моладзь—на перадавыя пазыцыі выкананьня пляну лесазагатовак.

РУДНІЦКІ Л.

Па-баявому ўзяліся за работу

Плешчаніцкая арганізацыя ЛКСМБ на-баявому ўзялася за выкананьне сваіх задач у сувязі з лесазагатоўкамі. Паміж раённым камітэтам ЛКСМБ і Плешчаніцкім леспрамгасам падпісаны дагавор аб сацыялістычным спаборніцтве па лінэйдацыі прарыву на лесазагатоўках.

Плешчаніцкая камсамольская арганізацыя абавязалася мабілізаваць усе ячэйкі і ўсю моладзь на выкананьне пляну лесазагатовак у раёне. Кожная ячэйка камсамолу павінна правесьці шырокую , папулярызацыю задач лесазагатовак сярод калектывістых, а таксама адзіначасобніку — беднякоў і сераднякоў. Кожная ячэйка ЛКСМБ павінна арганізаваць арцель-брыгаду ў ліку ня менш 25 чал. камсамольцаў, а таксама брыгады з моладзі і пасельніцтва кожнай вёскі і калтасу, якая за тэрмін лесазагатовак адпрацуе па 20 дзён. Кожная камсамольская ячэйка павінна арганізаваць сацспаборніцтва паміж сельсаветамі, калгасамі, вёскамі па найхутчэйшым выкананьні і перавыкананьні лесазагатовак. Ячэйкі павінны арганізаваць 4 раённыя абозы па вывазцы песаматар'ялаў, а апрача гэтага, кожная ячэйка арганізуе 3 абозы па вывазцы лесу са свайго сельсавету. 12-га сакавіка 1931 г. па ініцыятыве камсамольскіх ячэек арганізуецца ўсераённы ўдарны суботнік па распрацоўцы і вывазцы лесу, а таксама на падрыхтоўцы ўмоў да сплаву на які прыцягваюцца ўсе камсамольцы, бес партыйная моладзь, калгаснікі і сялянаадзіначасобнікі пад лёзунгам: «Выканаем па лесе пяцігодку за чатыры гады». Камсамольскія ячэйкі арганізуюць таксама на мясцох лесазагатовак ліквункты і забясьпечваюць іх кіраўнікамі.

Гэрэцо прыклад з плешчаніцкіх камсамольцаў, арганізуйце па-баявому лесазагатоўкі.

На грамадзкі буксір Чэрвеньскі РВК

Справа лесазагатовак па Чэрвеньскім леспрамгасе ідзе чарапаным крокам. Вучлесгасы са сваімі штатамі на мясцох, разам з сельсаветамі, ня маюць даговорванасьці аб замацаваньні той ці іншай вёскі за тым ці іншым вучлесгасам. Райвыканком па работу лесазагатовак глядзіць скрозь пальцы; дырэкцыя райлеспраму ня раз ставіла пытаньне перад райвыканкомам аб хутчэйшым замацаваньні вёсак за вучасткамі леспрама, аб чым ёсьць пастанова ўраду. Нават, калі прапаўнік леспраму абвяруўся да члена РВК—т. Бохана наконт замацаваньня вёсак, дык апошні адказаў, што «пакуль у нас на першым месцы плана, а потым ужо лесазагатоўкі». Гэта ў корані направільна, гэта недаацэнка ролі лесазагатовак у галіне нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Калі прапаўнікі вучлесгасаў на мясцох началі вербаваць рабсілу, дык некаторыя раённыя і цэнтральныя работнікі заявілі, што толькі з замаравкамі можна будзе прыступіць да лесазагатовак. РВК ніяк ня можа сабрацьць прэзыдыум, каб канчаткова разьмеркаваць вёскі, а становішча награжаючае. Мы маем у першым месяцы ўдарнага кварталу прарыў на фронце лесазагатовак, якія неабходна зараз-жа ліквідаваць. Сельсаветы на мясцох ня маюць дырэктыў ад РВК і ніякіх мер садзейнасьці ня прымаюць.

РВК сумесна з сельсаветамі зараз-жа павінен пераключыцца на баявы рэйкі, не адкладваючы гэтага ні на хвіліну. Трэба сабраць пазачарговы прэзыдыум і замацаваць вёскі за лесапрамгасам.

— Леспрамаўцы.

Выпраўляем памылку

У «Зьвяздзе» ад 13 лістапада ў сьпісе раёнаў, атрыманым з НКГ БССР, якія зрываюць адгрузку бульбы, зьмешчан і Пухавіцкі раён, які адгрузіў, выцдам, 13,4 проц. заданьня.

Пухавіцкі раён траціў на чорную дошку памылкова.

У Пухавічах перавыканалі пляну адгрузкі бульбы за межы БССР — на 12 лістапада раёнам адгружана 139 проц. заданьня.

Заваюем лясы на службу індустрыялізацыі

Беларусь — краіна лясоў. Чвэрта тэрыторыі Беларускай ССР пакрыта лясными масывамі, а з палов. мільёну гэкт. занята лясамі, якія хаваюць у сябе такія дрывяныя народы, як дуб, сасна, елка, ольха, бераэзьняк, ясень. На сваёй лясістасьці 25 проц. плошчы БССР займае першае месца сярод суседніх краін (Заходні раён РСФСР—24,5 проц. плошчы, УССР—7,3 проц., Польшча—22,8 проц., Літва—19,1 проц., Нямеччына—23 проц. плошчы).

Былыя ўласьнікі лясоў — памешчыкі глядзелі на лес толькі, як на крыніцу асабістых выгад і дранежніцкі зьнішчалі яго. Імпэрыялістычная вайна і першыя гады рэвалюцыі пакінулі таксама глыбокі адбітак на становішчы нашых лясоў.

За апошнія некалькі год лясная гаспадарка БССР ідзе шпаркімі крокамі па шляху аднаўленьня. Аб гэтым ленш за ўсё сьведчаць капітальныя ўкладаньні ў лясную гаспадарку. Так, у 1928-29 годзе ў гэтую справу было ўкладзена да 5 млн. руб., а за адзін толькі 1931 год вызначаецца капітальныя ўкладаньні ў лясную гаспадарку ў 16 млн. руб.

Лес—важнейшае багацьце БССР. Ён служыць сырцовай базай для лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасьці, ён патрэбен для фабрык запалак і паперы, для капітальнага будаўніцтва і капаньняў Данбасу. Беларуская фанэра і дубовыя краўзы—добры экспартны тавар, які ідзе ў рад краін Эўропы і Амэрыкі і дае магчымасьць замест лесу атрымліваць машыны і трактары.

Беларускія лясы даюць штогод дзесяткі мільёнаў рублёў прыбытку і дзесяткі мільёнаў кубічных мэтраў лесаматар'ялаў для патрэб індустрыялізацыі.

Так, у 1928-29 годзе для патрэб народнай гаспадаркі было адпушчана 12 млн. куб. мэтраў лесаматар'ялаў, а ў 1929-30 г.—15.500.000 куб. мэтраў.

Прыведзеныя лічбы даюць добрае прадстаўленьне аб лясных багацьцях БССР.

НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ Ў САЮЗЕ

Лясная і дрэваапрацоўчая прамысловасьць БССР за годы рэвалюцыі дасягнула буйнейшых посьпехаў. Удзельная вага дрэваапрацоўчай прамысловасьці ва ўсёй прамысловасьці БССР складае 16,4 проц. Па выпрацоўцы найбольш складаных асартымэнтаў тавару дрэваапрацоўчая прамысловасьць Беларусі стаіць на першым месцы ў Саюзе. У даваенны час валавая прадукцыя яе складала ўсяго 5 млн. руб., а ў 1931 годзе адна толькі дрэваапрацоўчая прамысловасьць дасьць прадукцыі на суму да 63 млн. руб.

У розных куткох БССР за апошні час вырас цэлы рад новых прадпрыемстваў лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасьці. Сярод іх найбольш каштоўным укладам зьяўляецца Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат, абсталяваны навейшымі машынамі.

Упяршыню арганізаваны і цэлы рад зусім новых вытворчасьцяй, як будаўнічыя дэталі, стандартныя часткі для дамоў, гнутая і масыўная мэбля, абозна-калёсная вытворчасьць і г. д.

ЗА ЎДАРНЫ КВАРТАЛ У ДРЭВААПРАЦОЎЧАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

Мінулы год работы пакінуў у дрэваапрацоўчай прамысловасьці шчыліну. Па лесапілаваньні праграма выканана на 100 проц. Затое, па фанэры заданьне выканана на 88 проц., а па цэмэнтных клёпках—на 90 проц. Замест 2.570.000 цэмэнтных клёпак выпушчана 1.900.000 камплектаў.

Асноўная прычына прарыву па фанэрнай вытворчасьці — недахват клеевых матар'ялаў. З гэтае прычыны некаторыя фанэрныя заводы спынілі працу на два тыдні. У сярэднім па ўсіх прадпрыемствах Лесбелу праграма 1929-30 г. выканана на 93 проц.

Крытыка і бібліяграфія

Супроць буржуазных тэорый

С. П. МАРГЕЛАЎ «БРОВАРНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ І ЯЕ ШТАНДОРТ НА ТЭРЫТОРЫЦІ СУЧАСНАЙ БССР» (1884—1927 г.)—Працы Беларускага Навукова-Дасьледчага Інстытуту сельскае і лясное гаспадаркі імя У. І ЛЕНІНА пры СНК БССР. Менск 1926 г. Тыраж—1000, стар. 58. Цана 65 кап.

Контр-рэвалюцыйны беларускі нацыянал-дэмакратызм ставіў сваёй мэтай змаганьне супроць дыктатуры пралетарыяту і рэстаўрацыю капіталізму. Ва ўсёй сваёй рабоце прадстаўнікі нацыянал-дэмакратызму імкнуліся накіраваць разьвіцьцё народнае гаспадаркі Савецкай Беларусі па капіталістычным шляху. Адсюль зразумела іх жаданьне папулярызаваць у сваіх работах капіталістычную гаспадарку тыпу Даніі і Прусіі. У сувязі з сваёй мэтавай устаноўкай на капіталістычны шлях разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР, нацыянал дэмакраты даводзілі, што ў разьвіцьці савецкай гаспадаркі назіраюцца тыя-ж заканамернасьці, што і ў разьвіцьці гаспадаркі капіталістычнай. Адсюль зусім зразумела імкненьне іх давесьці правільнасьць буржуазных эканамічных тэорый і магчымасьць прыстасаваньня іх для тлумачэньняў разьвіцьця савецкай гаспадарчай сыстэмы.

На жаль, на такі шкодны погляд стаў у рэцэнзаванай рабоце і тав. **Маргелаў.**

У сваёй рабоце «Броварная прамысловасьць і яе штандорт на тэрыторыі сучаснай БССР» тав. **Маргелаў** пастаніў мэтай дапасаваць тэорыю буржуазнага вучонага **Вэбера** аб прасторавым разьмяшчэньні прамысловасьці ва ўмовах капіталістычнай сыстэмы да савецкай гаспадарчай сыстэмы. Што гэта так, аб гэтым кажа сам тав. **Маргелаў.**

Спасылаючыся на антымаркысыцкую думку эканамістага Баранскага Н., што «кожны паступовы рух у галіне пытаньняў прасторавага разьмяшчэньня прамысловасьці магчымы толькі праз тэорыю Вэбера», тав. Маргелаў кажа: **«Практычнае дапасаваньне штандортнай тэорыі Вэбера да канкрэтнае сапраўднасьці зьяўляецца неадкладнаю задачэю сучаснасьці».** (Уступ стар. 7.— Падкрэсьлена намі—П. П.). Значыцца, тав. Маргелаў, слепа ідучы за Баранскім Н., лічыць, што вывучэньне пытаньня геаграфічнага разьмяшчэньня прамысловасьці магчыма толькі праз тэорыю Вэбера. Што-прадстаўляе сабою тэорыя Вэбера аб разьмяшчэньні прамысловасьці, скажам словамі заядлага супраціўнеўца—праф. Рыбнікава: «Работа Вэбера зьяўляецца у аспэктным працітам і далейшым разьвіцьцём ідэй, выказаных Цюненам.

... Прасторавым полем свайго досьледу Вэбер бярэ таксама, як і Цюнен, **гаспадарча-абмежаваную тэрытарыяльную адзінку».** (Асноўныя пытаньні эканам. геаграфіі, выд. 1930 г., ст. 67—пад аўтарам).

Такім чынам, мэтадалёгія Вэбера ў дасьледваньні геаграфічнага разьмяшчэньня прамысловасьці тая-ж самая, што і мэтадалёгія Цюнена ў адносінах вывучэньня разьмяшчэньня сельскай гаспадаркі, гэта аналіз, што аб'ектам дасьледваньня зьяўляецца капіталістычная,ізаляваная гаспадарка, якая разглядаецца не ў разьвіцьці, а ў статыцы (нярухомым, застыўшым стане). Вэбер, як і Цюнен, у сваім дасьледваньні абстрагуецца ад канкрэтнай сапраўднасьці, ад усёй яе складанасьці; ён зусім ігнаруе сацыяльныя клясавыя адносіны ў капіталістычнай сыстэме.

Такую асаблівасьць капіталістычнай сыстэмы, як рабочае перанасельніцтва, ён тлумачыць не разьвіцьцём машыннай тэхнікі, якая выціскае рабочых з вытворчасьці, а шчыльнасьцю насельніцтва, размнажэньнем яго. Вось гэту архі - буржуазную мэтадалёгію сакрысыў і папулярызаваў ў сваёй рабоце тав. Маргелаў. Праўда, ён робіць агаворку, што яго работа «зьяўляецца спробаю дапасаваць тэорыю Вэбера да тлумачэньняў канкрэтнага разьмяшчэньня броварнае прамысловасьці ў даваенны час, а таксама адшукаць асаблівасьці штандортных фактараў гэтае прамысловасьці ў «пераміных умовах на тэрыторыі БССР» (стар. 7). Аднак, гэта агаворка ні ў якай ступені ня можа рэабілітаваць тав. Маргелава. Бо замест таго, каб даць самую жорсткую крытыку буржуазнай тэорыі, пабудаванай на рэакцыйным законе «падаючай вытворчасьці затрат», тэорыю, шкодную для капіталістычнай сыстэмы,—тав. Маргелаў цалкам аказаўся ў палоне гэтай тэорыі. Ён, ідучы за кандрацьцеўцамі, Рыбнікавымі і лідэрам беларускага нацыянал-дэмакратызму Гарэцкім Г., даводзіць, што тэорыя Вэбера зьявілася «**магутнай мэтадалёгічнаю прыладаю для сьвядомага накіраваньня гаспадарчых працэсаў, зьвязаных з прамысловым раёнаваньнем**» (ст. 27 падкрэсьлена намі—П. П.). Прадстаўнікі маркысцкай канцэпцыі заўсёды разглядалі капіталістычную гаспадарчую сыстэму, як сыстэму, якая рэгулюецца стыхійнымі законамі рынку, а не сьвядомай воляй людзей, а тав. Маргелаў, скапіўшы на дуна антымаркысыцкую пазыцыю, лічыць, што буржуазная тэорыя Вэбера зьявілася фактарам для «сьвядомага накіраваньня гаспадарчых працэсаў». Лепшай паслугі для ідэалёгаў буржуазіі, для ўсіх ворагаў маркысызму-ленінізму, чым паслуга тав. Маргелава, цяжка прыдумаць.

Тав. Маргелаў пастараўся скарыстаць тэорыю Вэбера для тлумачэньня прасторавага разьмяшчэньня броварнай прамысловасьці ня толькі ў даваенны час, але-ж і пры савецкай плянавай сыстэме. Так, пры аналізе фактару, які зводна тэорыі Вэбера называе разьмяшчэньне прамысловасьці—сабекошт прадукцыі, тав. Маргелаў скарыстоўвае даныя гадавых справаздач броварных заводаў за 1926-27 год.

Далей, у падсэкцыі «Броварніцтва БССР і яго штандорт», тав. Маргелаў падкрэсьлівае, што «Штандортныя фактары броварніцтва, якія залежаць ад характару самае прамысловасьці, самі па сабе застаюцца... для сучаснасьці ў такім выглядзе, як мы іх выявілі раней. Група-ж фактараў налітычна-эканамічнага характару... падлягае зьменам і для сучаснасьці яна зусім іншая, чым у даваенны час» (ст. 44). Адначасьўтым, што да апошніх фактараў (палітычна-эканамічных) адносяцца ліквідацыя абшарніцкага зямлеробства і канцэнтрацыя броварніцтва ў руках дзяржаўнага устаноў, тав. Маргелаў кажа: «Вось галоўныя і вызначальныя зьмены, якія адбыліся ў сацыяльна-эканамічных і палітычных фактарах броварніцтва пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі» (ст. 44).

З пункту погляду т. Маргелава, такія ўмовы разьвіцьця прамысловасьці, як забесьпячэньне заводаў сырцём, рабочая сіла, перавозка прадукцыі (транспарт), цэны, якія ён досьць падрабязна разглядае, на мэтаду Вэбера, у адносінах даваеннай капіталістычнай броварнай прамысловасьці Беларусі,—гэтыя умовы застаюцца баз зьмен і ва ўмовах сучаснай прамысловасьці БССР. Зьмены адбыліся толькі ў нацыяналізацыі савецкай уладай зямлі і прамысловасьці.

Па Маргелаву выходзіць, што ў плянавай гаспадарчай сыстэме пераходнага перыяду пад савецкай абалонкай застаецца тая-ж самая вытворчая і эканамічная база, што і пры капіталізьме.

Пад гэтай анты-маркысцкай, антыленінскай устаноўкай падпішацца любы буржуазны ідэалёг. На сутнасьці гэтае самае даводзілі ў сваіх выступленьнях усе кандрацьцеўцы і беларускія нацыянал-дэмакраты.

Абмежаванасьць газэтнай рэцэнзіі не дае магчымасьці спыніцца на іншых шкодных установках у рабоце тав. Маргелава. Гэта работа, цалкам пабудаваная на варожай буржуазнай мэтадалёгіі, на карысьць толькі кандрацьцеўцам і нацыянал-дэмакратам. Недарма лідэр апошніх, Гарэцкі Г., над ідэйным кіраўніцтвам якога выконвалася работа, у сваёй прадмове кажа: «Такім чынам, **спроба С. П. Маргелава скарыстаць тэорыю штандорту В. ВЭБЕРА для тлумачэньня канкрэтнага разьмяшчэньня броварнае прамысловасьці дала станоўчыя вынікі. Яна яшчэ раз паказала, што тэорыя ВЭБЕРА дае дасьледчыку моцны мэтадалёгічны сродак для зразуменьня сапраўднага прасторавага разьмяшчэньня гаспадаркі»** («Прамова»—падкрэсьлена намі—П. П.).

Гарэцкі Г. цалкам здавялся посьпехамі тав. Маргелава ў скарыстаньні і папулярызацыі варожай маркысызму-ленінізму буржуазнай тэорыі ВЭБЕРА ў падвядзеньні гэтай тэорыі пад сучасную савецкую эканоміку. Вось чаму Гарэцкі дае такі добры водзыў аб рабоце, падкрэсьліваючы, што «Праца гэта сьведчыць, што **аўтар стаіць на правільным мэтадалёгічным шляху ў пытаньнях эканамічнай геаграфіі».** («Прадмова»—падкрэсьлена намі—П. П.). У сваю чаргу і тав. Маргелаў не застаецца ў даўгу перад Гарэцкім. У канцы свайго ўступу да работы, ён піша: «Лічу сваім прыемным абавязкам выказаць шчырую падзяку Г. У. Гарэцкаму за мэтадалёгічныя рады, якія ён мне ласкава аказаў пры выкананьні гэтае працы». Каментары да гэтага непатрэбны. «Зязюля хваліць пугача за тое, што пугач хваліць зязюлю» (з байні Крылова). У сувязі з гэтым, зусім зразумела, чаму тав. Маргелаў у сваёй зусім нядаўняй рабоце «Супроць беларускае кандрацьцеўшчыны» ні словам не абмовіўся аб лідэры яе—Гарэцкім Г., ня гледзячы на тое, што варожыя погляды Гарэцкага Г. ужо былі яскрава выкрыты на канферэнцыі аграрнікаў-маркысытых у сьнежні 1930 году.

ПІНЧУК П.

Арганізацыя Белптушкапрадукту

У мэтах рацыяналізацыі і разьвіцьця лесна-пушнай гаспадаркі, Эканомнарада пастанавіла арганізаваць пры Наркамтаздзе дзяржаўнае аб'яднаньне пад назвай «Белптушкапрадукт».

Арганізацыя Навукова-Дасьледчага Лясного Інстытуту

СНК пацьвердзіў сваю пастанову ад 23 жніўня аб перадачы пад загад ВСНГ БССР лясного аддзелу Навукова-Дасьледчага Інстытуту імя Леніна і аб рэарганізацыі гэтага аддзелу ў Навукова-Дасьледчы Лясны Інстытут, які будзе знаходзіцца ў Гомелі.

СНК пастанавіў звяльніць з работы ў інстытуце часовага дырэктара інстытуту праф. Сераду, работа якога не адпавядае дырэктывам ураду.

Паведамленьні

СЁНЬНЯ:

— **Кастрычніцкі РК КП(б)Б** склікае ў 7 гадз. веч., у клюбе зав. «Ударнік» (Н.-Маскоўская вул. № 35) делегацкі сход заводаў «Ударнік», «Чырв. Хэмік», малочны зав., лямп. ф-ка, абутк. майст. і мацін. ф-ка. Адказнасьць за яўку делегатак усклядаецца на сакратароў ячэек КП(б)В.

ЗАЎТРА:

— **Парттройка Фрунз. РКК КП(б)Б** (вул. Энгельса, 28) выклікае на 19 лістапада, у 6 гадз. веч., наступных т.т.: Зэльцэр, Вэрковіч М. А. (яч. хлебазаводу), Купрыяновіч, Люстэрнік Ш. Х. (яч. «Камунар»), Ходан, Зьмітровіч М. С. (стал. МЦРК), Васэрман (Белдзяржбуд), Башкевіч (яч. 2-й сав. б-цы), Краўчанка Н. А. (яч. «Д. А.»), Разонаў А. Ф. (яч. «Кастрычнік»), дырэктара т. Агала, сакратара парт. яч., старш. заўкому Абкамтрэсту — для ўдзелу пры разглядзе іх справу. Таксама выклікаюцца сакратары партячэек, дзе гэтыя т.т. лічацца на вучоне.

— **Парттройка Кастрычн. РКК КП(б)Б** (вул. К. Маркса, 3) 19 лістапада, у 6 а пал. гадз. веч. будзе разглядаць справы наступных т.т.: Ярашэвіча (абутк. ф-кі), Марголіна (абутк. ф-кі), Авідзона (вайск. арг.), Трацэўскага (саўбуд БДУ), Рудэрман (зав. «Бальшавік»), Тамашэўскага зав. «Бальшавік»), Райцэса (хэмфармзавод). Памянёныя т.т. запрашаюцца для ўдзелу пры разглядзе іх справу.

3-я сэсія ЦВК БССР 28 лістапада

У зьвязку з неабходнасьцю правядзеньня загатовак, у прыватнасьці сканчэньня бульбазагатовак, прэзыдыум ЦВК БССР пастанавіў перанесьці 3-ю сэсію ЦВК БССР IX-га скліканьня на 28-е лістапада 1930 г.

Сакратар ЦВК БССР
А. ХАЦКЕВІЧ.

Узмоцнім фінансавую базу пяцігодкі

КАНТРОЛЬНАЯ ЛІЧБА ЯШЧЭ НЕ ДАСЯГНУТА

На вёсцы рэалізавана толькі 75,5 проц. заданьня па пазыцы

Адкажам шкоднікам—контр-рэвалюцыянэрам дадатковай падпіскай на пазыку „Пяцігодка за чатыры гады"

Характарызуючы ход кампаніі рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» па асобных вучастках падпіскі, трэба адзначыць, што ў той час, калі 75 проц. раёнаў поўнасьцю выканалі кантрольныя лічбы, былыя акруговыя цэнтры недапушчальна адсталі.

МАЗЫР выканаў заданьне на 83,8 проц., БАБРУЙСК — на 89,8 проц., МЕНСК — 90,4, Віцебск — 95, Полацак — 97,1 проц., Магілеў — 97,8 проц., Гомель — 99,7 проц. Такім чынам толькі адзін Гомель наблізіўся да поўнага выкананьня заданьня.

У адносінах рэалізацыі пазыкі сярод рабочых і служачых адсталі наступныя раёны: Брагінскі, Горэцкі, Копыльскі, Нараўлянскі, Полацкі, Самахвалавіцкі, Сьмілавіцкі, Церахаўскі, Чаўчэрскі, Чэрыкаўскі і Шклоўскі.

Асаблівую ўвагу мы павінны зьвярнуць на рэалізацыю пазыкі на вёсцы, дзе няма яшчэ пералому. Зусім невыстарчальна ўцягнуты ў кампанію адзіна асобнікі. Сярод іх рэалізавана пазыкі толькі на 1.007.000 руб., прычым за наліўныя грошы толькі на 565.000 руб.

Значна больш, могуць дацы і капгасьнікі, сярод якіх рэалізавана толькі 772.000 руб.

У галіне рэалізацыі пазыкі сярод сялян асабліва адсталі Бабруйскі раён — 49 проц., Брагінскі — 48,6 проц., Бярэзінскі — 38 проц., Высачанскі — 27,9 проц., Глускі — 27,5 проц., Гарадоцкі — 37,4 проц., Грэскі — 47,9 проц., Дрыбінскі — 48,2 проц., Чырвонапольскі — 43,3 проц., Копыльскі — 40 проц., Рэчыцкі — 42,1 проц., Уваравіцкі — 40,9 проц., Церахаўскі — 35,2 проц., Чаўскі — 42,1 проц.

Гэтыя раёны ня выканалі нават паловы заданьня ў той час, калі апошні тэрмін падпіскі на вёсцы — 1 сьнежня.

У калгасах, сельсаветах трэба арганізаваць ударныя двухтыднёвікі па правядзеньні падпіскі і ўцягненьні ў яе сялян-адзінаасобнікаў, шляхам выклікаў на сацсаборніцтва, узяцьця на грамадзкі бункір і г. д.

А. Л.

Выклікаем друкарню імя Сталіна

Дадатковая падпіска на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» па друкарні «ЗЬВЯЗДА» праходзіць з вялікім посьпехам. За тры дні падпісалася звыш 40 рабочых на суму 1.140 руб.

Рабочыя друкарні «Зьвязды» выклікаюць пасьледваць іх прыкладу рабочых 1-ай дзярждрукарні імя Сталіна і друкарні БАН.

Падпіска працягваецца.

Яна праходзіць пад лёзункам «дадатковай падпіскай на пазыку адкажам шкоднікам—контр - рэвалюцыянэрам, якія імкнуліся падарваць абароназдольнасьць пралетарскай краіны».

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Редакцыя і галоўная контора
Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74	Начны рэдактар	6-42
Сакратар	6-19	Галоўная контора	7-81
Партсэктар	13-80	Аддзел падпіскі	7-81
Сэктар інфармацыі	15-80	„ абвестак	7-81

Умовы падпіскі
(з дарамовым дадаткам „Прафух")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р.
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Плата за абвесткі:
За радок нонп. пасьля тэксту - 50 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Пасьля тэксту—у два разы дарожэй. При шматразовым друкаваньні—сьпідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г., спагнана 10 проц. падатку.
Падпіска і абвесткі прымаюцца ў газ. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81).

Калектыў супрацоўнікаў ЦКК-НКРСІ Бел. выказвае сваё спачуваньне сябру калектыву **Т. Пятрунісу В. П.** з прычыны сьмерці яго дачкі

КЛАРЫ.

ДА УВАГІ КАЛЕКТЫВАЎ І ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ!

СЭКТАР ДРУКУ БЕЛАРУСКАГА КІРАЎНІЦТВА СУВЯЗІ АБВЯШЧАЕ,

што ў мэтах зьнішчэньня скаргаў на неатрыманьне газэт, асабліва ў першыя дні падпіснога месяца

КАНЧАТКОВА СПЫНЯЕ ПРЫЁМ ПАДПІСКІ З 27 ЧЫСЛА КОЖНАГА МЕСЯЦА.

Таму просім усіх упаўнаважаных па друку прадпрыемстваў і устаноў, а таксама арганізатараў падпіскі ПРЫСЛАЦЬ ДА ЗБОРУ ПАДПІСКІ ад рабочых і служачых свайго калектыву **не пазьней 14 XI.**

Сабраную падпіску **не затрымліваць, а здаць для выкананьня ў газэтнае бюро** (буд. пошты), або яго працаўніку, **пачынаючы з 15 XI.**

Адначасова звяртаем увагу упаўнаважаных і арганізатараў на правільнасьць адрасоў падпісчыкаў при складаньні спісаў падпісчыкаў.

Трэба памятаць, што няправільны адрас выклікае непаразуменьні і скаргі на неатрыманьне газэт.

СЭКТАР ДРУКУ БЕЛАР. КІРАЎН. СУВЯЗІ.

СЁНЬНЯ 18 ЛІСТАПАДА а 6 гадз. увеч.

склікае сьпіка

ЧАРГОВЫ ПЛЕНУМ ЦСПСБ

З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ:
1) Чарговыя задачы прафсаюзаў у сувязі з ліквідацыяй акруг (т. Рыжкоў).
2) Вынікі праверкі калягаваньня і перазацьвярджэньне іх (т. Каменштэйн).
3) Вынікі работы прамысловасьці за 1929-30 год і кантрольныя лічбы на 1931 год (т. Грысевіч).

Пленум адбудзецца ў залі пасяджэньняў ЦСПСБ.

Усе выдатні за праезд на вагоны за кошт саюзаў.

ЦСПСБ.

У сераду, 19 лістапада, роўна ў 7 гадз. веч., у памяшканьні залі пасяджэньняў гарсавету (Пляц Волі № 4, 3-ці паверх) адбудзецца

ПАСЯДЖЭНЬНЕ ПЛЕНУМУ ГАРСАВЕТУ

сумесна з прымацаванымі да працы ў савеце дэлегатамі і рабочымі прадпрыемстваў.

Яўка абавязкова. Запрашаецца актыў Асоавіяхіму.

Парадак дня: 1) «Аб дэнадзе абароны». 2) Бягучыя справы.

Кастрычні і РК КП(б)Б разам з рэдакцыямі газэт «ЗЬВЯЗДА» і «РАБОЧЫ»

СКЛІКАЕ 20 ЛІСТАПАДА

у 6 гадз веч. у памяшк. клюбу ЛЕНІНА (пас. вакз.)

НАРАДУ

рэдкалегій шматтыражак, насьценгазэт, рабкораў

з наступным парадкам дня:
1) Задачы рэдкалегій: шматтыражак, насьценгазэт і рабкораў у выкананьні прамфінпляну ўдарнага кварталу і падрыхтоўка да прамфінпляну на 1931 г. (дакл. адказн. рэдактара газ. «Зьвязда» тав. БУДЗІНСКАГА).
2) Даклады сакратароў партканктыкаў: чыгункі, «Энергіі», «Бальшавіка», шчат. ф-кі і абутк. ф-кі аб выкананьні пастановы бюро РК па кіраўніцтве рэдкалегіямі і рабкораўскім рухам.
3) Даклады аб ходзе падпіскі на газэты.

На нараду павінны зьявіцца сакратары ячэек, старшыні заўкомаў, рэдкалегій шматтыражак і насьценгазэт, рабкоры, сэктары друку ячэек, упаўнаважаныя па падпісцы на газэты.

ВЫТВОРЧАСЬЦЬ НЕНАВІСЬЦЬ БЕЛДЗЯРЖКІНО

ПАТРЭБНА вопытная **МАШЫНІСТКА,** якая добра ведае бел. мову. Звяртацца ў рэдакцыю газ. «ЗЬВЯЗДА» (Савецкая, 63, 3-ці паверх.

МЯНЯЮ КВАТЭРУ з 3-х пакояў з усімі выгодамі ў Гомелі на кватэру ў Менску. Круглы, 16, кв. 1, ТУРЫНА.

ЗНОЙДЗЕНЫ дакументы на імя Брыцько, А. А. Атрымаць ў м-ры „Зьвязды".

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

Сёньня, 18 лістапада, для саюзу прамастацтва **„КАЛЯ ТЭРАСЫ"**

Пачатак а 8 гадз. увеч.

Гукавое кіно **„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"** — 2-гі тыдзень **ГУКАВАЯ ПРАГРАМА** вытворчасьці Белдзяржкіно. Пачатак сэансаў: 6 гадз., 7 г. 20 м., 9 гадз. і 10 гадз. 30 м. Каса ад 4 гадз. дня.

Кіно-тэатр **„Культура"** — **ЗЯМЛЯ ПРАГНЕ** Звыш праграмы **вялікі канцэрт.** Пачатак сэансаў дзённых: а 1 гадз. і 2 гадз. 30 м. Увечары: 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м. Каса адчынена з 12 гадз.

КІНО **„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"** — Нямецкі фільм **ДЗЕЛЯ ДЗІЦЯЦІ** (КРЫВАПРЫСЯГА). Пачатак 1 с. а 6 г. Каса ад 4 гадз. 30 м.

КІНО **„Пралетары"** — Мастацкі фільм **Невядомая асоба** Надзвычайная п'еса з жыцьця катрэсаў у 6 частках. Звыш праграмы хроніка „Союзкино" № 54. Пачатак 1 сэансу у 6 гадз. Каса ад 5 гадз.

Кіно **„ЮНЫ ПІ�янэр"** — Спартыўны фільм **УДАЛЫ СКОК** камедыя ў 5 частках. Звыш пр. хроніка „Союзкино" № 61. Пачатак 1 с. у 1 г. дня. Каса ад 12 гадз. дня.

КІНО **„ПартаК"** — З прычыны посьпеху 2-гі тыдзень 1-я серыя **НІБЭЛУНГІ** трагедыя ў 12 част. Пачатак сэансаў: 6 г. 30 м., 8 г. 45 м., 10 г. 45 м. Каса ад 5 гадз.

Завочныя бухгальтарскія курсы

Прыём слухачоў праводзіцца круглы год. Прымаюцца асобы з 17-гадовым узростам з асьветай ня вышэй 5 гр. 7-годкі

ПЛАТА ЗА КУРС 33 РУБ.

праводзіцца так: 9 руб. пры паступленьні на курсы, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8-ы месяц і па 4 руб. на працягу 6 месяцаў у пачатку кожнага навучальнага месяца.

Заявы, запытаньні і грошы паміраўваць на адрасе:

Менск, пошта, скрынка 44, Завочным курсам

На адказ прыкладаць 2 маркі па 10 кап.

Паведамленьні ў чарговы нумар „ЗЬВЯЗДЫ" прымаюцца да 2 гадз. дня

ЗОА-ВЫСТАУКА ЗЬВЯРЫНЕЦ

ДЗЯРЖЦЫРКУ Савецкая, 90, рог Ленінскай

адкрыта штодзенна з 8 г. ран. да 11 г. увеч.

ПРЫБЫЛІ НОВЫЯ ЗЬВЯРЫ:

леў, леапард, гіена палосатая, гіена плямістая, ваўкі, мядзьведзі, рысь, мураўеды, дзікабразы, барсукі, алень, вярблюд, арлы, крападзіл, 20 малп і шмат іншае зьвярыны.

Школам і экскурсіям—ільготная плата, скідка 40 проц.

АДМІНІСТРАЦЫЯ.

ЭЛЬВОД

паведамляе, што

прыём заяў на дадатковыя

ЭЛЕКТРА-ЛЯМПАЧКІ І ЭЛЕКТРА-ЎВОДЫ

праводзіцца наступным парадкам:
члены прафсаюзаў зварачаюцца за дазволам у свой прафсаюз праз заўком,
пэнсіянэры гарадзкой страхкасы—у гарстрахкасу,
пэнсіянэры чыгуначнай страхкасы—у чыг. страхкасу,
інвапіды сабезу—у сабез,
вайскова-служачыя—праз вучастковага інжынэра,
члены прамысл. арцеляй—праз сампрамкаапэрацыю,
члены інвалідная каапэрацыі—праз БСІКА,
члены арцеляй гар. камітэту ўзаемадапамогі—праз гарком узаемадапамогі,
супрацоўнікі ДПУ—праз заг. аддз. абанэнтаў Эльводу.

Атрымаўшыя дазвол ад сваіх арганізацый, з дазволам зварачаюцца на Эльвод у аддзел абанэнтаў для тэхнічнага выкананьня работы.

Тым грамадзянам, якім асобнага ўводу рабіць не патрэбна, а толькі далучыць да ўнутранай існуючай праводкі, неабходна прад'явіць на Эльвод, сумесна з дазволам сваёй арганізацыі на дабаўленьне электр. лямпачкі, пісьмовую згоду абанента з № абанэнтнай кніжкі, да праводкі якога жадаюць далучыцца.

Тэхнічныя работы будуць выкананы Эльводам па пабудове толькі надворных уводаў у 10-дзённы тэрмін са дня аплаты каштарысу.

ЭЛЬВОД.

БАЦЬКІ! ВАШЫ ДЗЕЦІ ХОЧУЦЬ ЧЫТАЦЬ СВАЕ ГАЗЭТЫ І ЧАСОПІСІ. ВЫ ПАВІННЫ ДАПАМАГЧЫ ІМ ВЫПІСАЦЬ.

ПІОНЭР БЕЛАРУСІ

Газэта піянэраў і школьнікаў Беларусі.
ОРГАН ЦК ЛКСМБ
ВЫХОДЗІЦЬ ДВА РАЗЫ НА ТЫДЗЕНЬ
Лепшы сябра, лепшы дапаможнік у працы і вучобе. Усе рэбята павінны чытаць гэтую танную і карысную газэту.
Сьпяшэце хутчэй падпісацца, старайцеся сваячасова здаць падпісную плату. Чым больш падпісчыкаў, тым лепшая будзе газэта.

ЮНГЕР ЛЕНІНЕЦ

(ЮНГЕР ЛЕНІНЕЦ)

Даёш 15.000 экземпляраў!

Усе выпісваюць лепшага друга і школьнага таварыша—„ЮНГЕР ЛЕНІНЕЦ" ударнымі тэмпамі—за работу!

Уся дзетвора—чытачы „ЮНГЕР ЛЕНІНЕЦ".

Падпісвайцеся на адзіную ў БССР дзіцячую часопісь „ІСКРЫ ІЛЬЛІЧА"

орган ЦК ЛКСМБ і Каркамасьветы.

1. «Іскры Ільліча» самая патрэбная нарысная і цікавая часопісь для пачатковых школ, для малодшых піянэраў, для акцябрат дзіцячых дамоў і садоў.
2. Новыя п'есы, вершы, нарысы, галаваломкі, жарты, прыгожыя малюнкі ў фарбах—усё гэта вы знойдзеце ў часопісі «Іскры Ільліча».
3. «Іскры Ільліча» даюць многа каштоўнага матар'ялу ножнаму настаўніку пачатковай школы, кіраўніку дашкольных устаноў, павадыру групы акцябрат і павадыру атраду.
4. У «ІСКРЫ ІЛЬЛІЧА», апрача арыгінальных твораў беларускіх пісьменьнікаў, друкуюцца творы для дзяцей з расейск., украінск., нямецк. і інш. моваў.

Настаўнікі! організуйце колектыўную падпіску сярод вучняў.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

	1 месяц	3 месяцы	6 месяцаў	1 год
Газ. «ПІОНЭР БЕЛАРУСІ»	10 к.	30 к.	60 к.	1 р. 20 к.
Газ. «ЮНГЕР ЛЕНІНЕЦ»	10 к.	30 к.	60 к.	1 р. 20 к.
Час. «ІСКРЫ ІЛЬЛІЧА»	15 к.	45 к.	90 к.	1 р. 80 к.

Падпіску здавайце на пошту і ў кантору Выдавецтва „ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА" (Менск, Комсамольская, 25).

Друкарня газ. «Зьвязда», Менск.

Менск. Гапоўлітбел 337.